Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

НОМЕР НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Телефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 60 к. „ 3 „ — 2 р. 70 к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шыпарокі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шыпарокі пасьлядтэксту 1 р. — к. За радок шыпарокі перад тэкстам 1 р. 50 к. Абвесткі на 50 проц. дарожэй. Знак тарыфу бярэцца 10 проц. шэрагу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт — 35 коп. За кожны дадатковы — 15 „ Воспрацоўк. і чырвонаармейцы за дакумэнт — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 102 (2591) Чацьвер 9-га мая 1929 г.

IX УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ.

УРАЧЫСТАЕ АДЧЫНЕНЬНЕ ЗЬЕЗДУ.

...а, 8 мая, а 6-й гадзіне ўвеча... памяшканьні Дому Культуры ся ўрачыстае адчыненьне IX ...руская Зьезду Саветаў. Вялі... ля Дому Культуры, упрыгожа... ...ангамі і сьцягамі, была да ад... ...апоўнена делегатамі і гасьцямі.

Чарвякоў адчыніў зьезд карот... ...амовай, у якой адзначыў вялі... ...сягненьні Савецкай Беларусі за ...і пэрыяд і тыя задачы, якія ...перад краінай у будучыне.

...цоўныя г. Менску ў арганізава... ...радку зьявіліся прывітаць да

...РАМОВА тав. ЧАРВЯКОВА.

...арышы! На даных Мандатнай ...і прыбыло 559 делегатаў з па... ...чым голасам і 168 делегатаў з ...ным голасам. Гэты лік делегатаў ...цца дастатковым для адчынень... ...ебеларускага Зьезду Саветаў.

...падставе гэтага дазвольце IX ...Саветаў Рабочых, Сялянскіх і ...нармейскіх Дэпутатаў Беларус... ...авецкай Сацыялістычнай Рэспуб... ...галасіць адчыненым. (Воплескі. ...нацыянал).

...арышы! IX Усебеларускі Зьезд ...аў пачынае працу праз 10 год ...я I Усебеларускага Зьезду Саве... ...які адбыўся ў сакавіку 1919 г. ...д таму назад арганізавалася Бе... ...ь, як дзяржава дыктатуры пра... ...ляту дзеля барацьбы за сацыя... 10 год таму назад на I Зьезьдзе ...аў рабочыя і працоўнае сялян... Беларусі ўрчыста заявілі аб ...рашчай волі весьці пад кіраў... ...ам Камуністычнае партыі ў не... ...цўнай і шчыльнай злучнасьці з ...ючымся пралетарыятам і працоў... ...сялянствам усяго сьвету барацьбу ...а зьнішчэньне ўсялякае экспляёа... ...чалавека чалавекам, за поўнае ...чэньне падзелу грамады на кля... ...а бязьлітаснае падаўленьне экс... ...ператараў, за ўстанаўленьне сацыя... ...чнай арганізацыі і перамогу са... ...ізму ва ўсім сьвеце.

...мінулыя 10 год Савецкая Бела... ...прайшла праз вайну, праз налёт, ...праз разбурэньне, праз неда... ...праз ахвяры і перашкоды. Аднак, ...працоўных Беларусі да барацьбы ...лькі не зламалася, але яшчэ ...загартавалася. У жорсткай ба... ...супроць абшарнікаў і капіта... ...супроць наймітаў і банд усіх ...ых імперыялістаў, супроць усіх ...падворнай і ўнутранай контр-рэ... ...ыі рабочыя і сяляне Беларусі, у ...м саюзе з рабочымі і сялянамі ...Савецкага Саюзу, адстаялі Са... ...ю ўладу.

...цоўныя Беларусі за 10 год да... ...вялікіх посьпехаў у галіне на... ...льнага разьвіцьця па сацыялісты... ...ым шляху эканамічнага і куль... ...ага адраджэньня.

...кіраўніцтвам Камуністычнае ...і, пры братэрскай дапамозе Са... ...ага Саюзу, рабочыя і сяляне Бе... ...і зжылі разбурэньне, дабіліся па... ...ньня сацыялістычнай прамысло... ...і бяруцца за грунтоўную пера... ...у распыленай сялянскай гаспа...

...мінулыя 10 год палепшыўся да... ...т рабочых і сялян, магутна рас... ...ла беларуская культура, нацыя... ...ая на форме і пралетарская на ...ту, замацавалася супрацоўніцтва ...ўных усіх нацыянальнасьцяў Са... ...й Беларусі.

...абліва значныя посьпехі мае Са... ...я Беларусь за мінулыя 2 гады, ...праца сацыялістычнага, гаспадар... ...і культурнага будаўніцтва была ...ка разгорнута. Скончыўшы сваё ...каўна-праўнае афармаваньне на ...ым Зьезьдзе Саветаў, уключыўшы ...й склад усе сумежныя тэрыто... ...большасьцю беларускага насель... ...а Савецкая Беларусь на працягу ...ніх 2 гадоў пры магутнай дапа... ...з боку Савецкага Саюзу, пры ...е самых шырокіх колаў працоў... ...гораду і вёскі, разгортвала са... ...істычную гаспадарку і культур... ...будаўніцтва.

...кім парадкам, таварышы, мы ба... ...м што на працягу ўсяго мінулага ...годзьдзя рабочыя і працоўнае ся... ...тва Савецкай Беларусі бязупынна ...ліся да таго, каб выканаць той ...вак, які быў узяты імі на I Зьезь... ...Саветаў.

...зьвіцьцё Савецкай Беларусі, посьпе... ...нашага будаўніцтва даюць у рукі ...оўных Беларусі магутную сілу ...далейшага разгортваньня сацыя... ...ічнага будаўніцтва.

...К Усесаюзнай Камуністычнай пар... ...бальшавікоў, прыслаўшы сваё пры... ...льне працоўным Беларусі з пры... ...ы 10-годзьдзя абвяшчэньня БССР, ...звае ўпэўненасьць у тым, што на ...прагу новага 10-годзьдзя рабочыя і ...яне Беларусі, пад кіраўніцтвам Ка... ...істычнае партыі, разгортваючы ...э больш рашучы наступ на капі... ...стычныя элементы, дружнымі су... ...ньнымі сіламі абяцца больш значн... ...е посьпехаў у справе гаспадарчага ...льтурнага ўзьдму, у галіне ўзмац... ...ньня і разьвіцьця сацыялізму ў го... ...зе і ў вёсцы.

Каб апраўдаць тую надзею, якую ўскладае на працоўных Беларусі Усесаюзная Камуністычная партыя, мы павінны, таварышы, прысьвяціць працу IX Усебеларускага Зьезду Саветаў усебаковаму абгаварэньню тых задач, што высунула Камуністычная партыя перад працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу на даным гістарычным этапе.

У адозьве, якая была прынята XVI Усесаюзнай канфэрэнцыяй, камуністычная партыя вызначае гэтыя задачы такім парадкам: „мы павінны,— гаворыцца ў гэтай адозьве—у параўнаўча кароткі гістарычны тэрмін дагнаць і перагнаць у тэхнічна-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны, вызвалены сацыялістычную рэканструкцыю ўсяе народнае гаспадаркі. Мы павінны забясьпечыць шпаркі рост індустрыі і разам з тым уздым сельскай гаспадаркі, усё больш разгортваючы буйную аграмаджаную гаспадарку ў вёсцы—(савгасы, калгасы) на падставе вышэйшай ма...

У мандатнай камісіі.

...шыннай тэхнікі. Мы павінны разгарнуць шырокі рух мас за культуру, мы павінны зьнішчыць марнатраўства, безгаспадарчасьць, валакіту і бюракратызм у нашым дзяржаўным апараце. Мы павінны павесьці далейшае наступленьне на капіталістычныя элементы. Мы павінны перамагчы капіталістычныя элементы ня толькі ў горадзе, але і ў вёсцы. Мы павінны няўхільна ўмацаваць абароназдольнасьць Савецкага Саюзу".

Вось тыя задачы, што па думцы камуністычнай партыі павінны стаяць перад працоўнымі ўсяго Савецкага Саюзу на даным гістарычным этапе. Гэтыя задачы ў першую чаргу стаяць перад Савецкай Беларусьсю, бо нам, па мяжы з капіталістычным сьветам, трэба ў першую чаргу асабліва добра вырашаць усе задачы, якія стаяць перад Савецкім Саюзам.

IX Зьезд павінен абгаварыць гэтыя задачы, павінен прыстасаваць гэтыя задачы да ўмоў Беларусі і распрацаваць мерапрыемствы для найлепшага выкананьня гэтых задач.

IX Зьезд павінен уключыць працоўных Беларусі ў сацыялістычнае спаборніцтва з іншымі Савецкімі Рэспублікамі за лепшае вырашэньне гэтых важнейшых на даным гістарычным этапе задач.

IX Зьезд павінен адчыніць новае слаўнае 10-годзьдзе Савецкай Беларусі.

Таму трэба, каб IX Усебеларускі Зьезд Саветаў працаваў з асаблівай напружанасьцю, адчуваючы сваю адказнасьць перад працоўнымі Савецкай Беларусі і перад працоўнымі Савецкага Саюзу.

Дазвольце, таварышы, выказаць цьвёрдую надзею на тое, што дэлегаты IX Усебеларускага Зьезду Саветаў, прыехаўшы сюды з такім запалам, да канчатковай перамогі сацыялізму, які зьяўляецца характэрным для працоўных мас Савецкай Беларусі, прыложаць усе свае сілы для таго, каб пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі вырашыць важнейшыя гістарычныя задачы, якія перад імі стаяць.

Няхай жыве працяг нашай барацьбы за сацыялізм!

Няхай жыве далейшае разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва!

Няхай жыве IX Усебеларускі Зьезд Саветаў!

(Воплескі. Інтэрнацыянал).

АБРАНЬНЕ ПРЭЗЫДЫУМУ ЗЬЕЗДУ

Тав. **Чарвякоў**: Для прапазыцыі аб арганізацыйным рэканструіраваньні IX Усебеларускага Зьезду Саветаў слова мае тав. **Хацкевіч**.

Тав. **Хацкевіч**: Таварышы, я прапаную ад імя камуністычнай фракцыі IX Усебеларускага Зьезду Саветаў абрацъ склад Прэзыдыуму Зьезду ў ліку 77 таварышоў.

Тав. **Чарвякоў**: Ці ёсьць іншыя прапазыцыі? Няма. Дазвольце паставіць гэтую прапазыцыю на галасаваньне. Хто за тое, каб прапазыцыю тав. **Хацкевіча** зацьвердзіць, прашу падняць мандаты. Прашу апусьціць. Хто супроць альбо ўстрымаўся? Няма. Прымаецца.

Тав. **Хацкевіч**: Ад імя камуністычнай фракцыі Зьезду Саветаў прапаную наступны персанальны склад Прэзыдыуму Зьезду:

Ашаровіч, Аксючыц, Амбражунас, Арнольдаў, Аскерка, Бобрык, Бэйлін, Баліцкі, Барсукоў, Аронштам, Бэнэк, Буглак, Васілевіч, Валодзька, Гамарнік, (воплескі), **Галадзед, Гантман, Грысевіч, Грыбаў, Гаварэц, Гулевіч, Галавач, Драздоў, Ермак, Ерашэнка, Забалокіна, Ігнатоўскі, Іваноў, Ісат, Ізвольская, Карклін, Карп, Крэмер, Калнін, Каплан, Кажэўнікаў, Куцякоў, Карсева, Крампульс, Касякова, Луцэвіч** (Янка Купала), **Малаковіч, Малашонак, Матус, Мікуліч, Мікалаенкава, Максімаў, Нахільніцкі, Піляр, Платун, Прышчэпаў, Пічэта, Прусакова, Рыжоў, Рачыцкі, Рагачэўскі, Рудкоўская, Славінскі, Самойлаў, Стасевіч, Сянькевіч, Саевіч, Семянцоў, Сяргеява, Сяргушкін, Ставер, Старавойтава, Унароўскі, Ульянаў, Хацкевіч, Хандогі, Цімашэнка, Чарвякоў** (воплескі), **Чарнецкі, Шапіра, Шчацько, Ягораў** (Камандуючы Войскамі Беларускае акругі) (Воплескі).

Тав. **Чарвякоў**: Ці будуць якія-небудзь запытаньні па гэтаму персанальнаму сьпісу? Няма. Якія будуць прапазыцыі?

(Галасы: Зацьвердзіць).

Стаўлю на галасаваньне. Хто за тое, каб Прэзыдыум у даным складзе зацьвердзіць, прашу падняць мандаты. Прашу апусьціць. Хто супроць, альбо ўстрымаўся? Няма. Прэзыдыум Зьезду зацьвярджаецца аднагалосна. (Воплескі). Прашу членаў абранага Прэзыдыуму Зьезду заняць месцы ў Прэзыдыуме. (Воплескі).

Тав. **Хацкевіч**: У Сакратарыят Зьезду ад імя камуністычнай фракцыі прапануецца абрацъ 13 таварышоў.

Тав. **Чарвякоў**: Ці ёсьць іншыя прапазыцыі? Няма. Дазвольце паставіць на галасаваньне. Хто за тое, каб абрацъ Сакратарыят Зьезду ў ліку 13 асоб, прашу падняць мандаты. Прымаецца.

Тав. **Хацкевіч**: Персанальны склад Сакратарыяту Зьезду прапануецца наступны: **Вайтэнка, Васілевіч, Вансоўскі, Дышмер, Зайцаў, Кантаровіч, Кроль, Марозаў, Паўлюкевіч, Прафэрансаў, Розін, Сьвірыдаў, Яцкевіч.**

Тав. **Чарвякоў**: Дазвольце паставіць на галасаваньне. Стаўлю на галасаваньне. Хто за тое, каб зацьвердзіць прапанаваны склад Сакратарыяту прашу падняць мандаты. Хто супроць альбо ўстрымаўся? Няма. Прымаецца.

Тав. **Хацкевіч**: Мандатную Камісію Зьезду прапануецца абрацъ у складзе 17 таварышоў.

Тав. **Чарвякоў**: Стаўлю на галасаваньне. Хто за тое, каб абрацъ Мандатную Камісію ў ліку 17 асоб. Хто супроць альбо ўстрымаўся? Няма. Прымаецца.

Тав. **Хацкевіч**: Персанальны склад Мандатнай Камісіі прапануецца наступны: **Буйнаў, Дзякаў, Дубіна, Кананаў, Каплан, Кулак, Крузмат, Кавалёва, Лакціёнаў, Міцькоў, Масальскі, Сташэўскі, Пугачова, Рабіновіч, Рэдзько, Фалейчык, Шаліма.**

Тав. **Чарвякоў**: Дазвольце паставіць на галасаваньне. Хто за тое, каб зацьвердзіць гэты склад Мандатнай Камісіі, прашу падняць мандаты. Прашу апусьціць. Хто супроць альбо ўстрымаўся? Няма.

Тав. **Хацкевіч**: Рэдакцыйную Камісію Зьезду прапануецца абрацъ у складзе 12 таварышоў.

Тав. **Чарвякоў**: Няма супярэчнасьцяў?

(Галасы: Няма).

Тав. **Хацкевіч**: Персанальны склад Рэдакцыйнай Камісіі прапануецца наступны: **Асьмоў, Васілевіч, Ісаеў, Кудзелька, Міцкевіч,** (Якуб Колас), **Кандраль, Калевіч, Курцік, Пятровіч, Шукевіч, Шастакоў, Шыпіла.**

Тав. **Чарвякоў**: Стаўлю на галасаваньне. Хто за гэты склад, прашу падняць мандаты. Прашу апусьціць. Прымаецца. Цяпер аб парадку дню.

Тав. **Хацкевіч**: Парадак дню IX

Дэлегаты Бабруйшчыны.

Усебеларускага Зьезду Саветаў прапануецца наступны:

1. Справаздача Ўраду БССР.
2. Пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР:
   а) Агульны даклад.
   б) Пяцігадовы плян прамысловасьці (дзяржаўнай, мясцовай і саматужнай).
   в) Пяцігадовы плян разьвіцьця сельскай гаспадаркі (вытворчае каапэраваньне, уздым ураджайнасьці).
   г) Пяцігадовы плян разьвіцьця культуры.
3. Даклад камандуючага Беларускае вайсковае акругі аб становішчы Чырвонай арміі.
4. Выбары Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.
5. Выбары ад БССР членаў Савету Нацыянальнасьцяй ЦВК СССР.

Чацьвертае пытаньне, якое было намечана раней у парадку дню Зьезду,— аб зьменах у Канстытуцыі БССР, прапануецца з парадку дню зьняць.

Тав. **Чарвякоў**: Ці ёсьць якія-небудзь запытаньні альбо прапазыцыі да таго, што агаласіў тав. Хацкевіч? Няма. Ёсьць прапазыцыя, каб зацьвердзіць парадак дню з тымі зьменамі, якія агалошаны тав. Хацкевічам. Стаўлю на галасаваньне. Хто за тое, каб зацьвердзіць гэты парадак дню, прашу падняць мандаты. Хто супроць, хто ўстрымаўся? Няма. Зацьвярджаецца.

Тав. **Хацкевіч**: Цяпер аб рэгляманце працы IX Усебеларускага Зьезду Саветаў. Рэгламант прапануецца наступны:

1. Пасяджэньні зьезду адбываюцца з 10 гадзін раніцы да 3-х гадзін дню і з 6 гадзін вечары да 9 гадз.
2. Дакладчыкам для дакладу даецца: а) па справаздачы ўраду БССР без вызначэньня тэрміну; б) Па агульнаму дакладу па пяцігодзьдзі 2 гадзіны; в); Пяцігадовы плян разьвіцьця прамысловасьці—1 гадз., г) Пяцігадовы плян разьвіцьця сельскай гаспадаркі 1 гадзіна; д) Аб сацыяльна-культурным будаўніцтве—1 гадзіна; е) Аб становішчы Чырвонай арміі 1 в пал. гадзіна
3. Для заключнага слова—1 гадзіна.
4. У парадку спрочак кожнаму прамоўцу даецца слова ня больш як два разы: першы раз—10 хвілін, другі раз—5 хвілін.
5. Па кожнай прапанове даецца слова: аднаму—за і аднаму—супроць, па 5 хвілін кожнаму. Запытаньне і прапановы падаюцца ў пісьмовай форме ў Прэзыдыум Зьезду.
6. Слова па парадку вядзеньня пасяджэньня—3 хвіліны.
7. Па асабістых пытаньнях слова для заяў даецца ў канцы пасяджэньня па 3 хвіліны.
8. Кожная група делегатаў у колькасьці ня менш, чым 50 чалавек, мае права па пытаньнях парадку дню Зьезду выставіць свайго садакладчыка, якому для садакладу даецца 40 хвілін і для заключнага слова—15 хвілін.
9. Пытаньні вырашаюцца простай большасьцю галасоў.

Тав. **Чарвякоў**: Ці ёсьць якія-небудзь дадаткі? Няма. Стаўлю на галасаваньне. Хто за гэты рэгламант прашу падняць мандаты. Прашу апусьціць. Хто супроць альбо ўстрымаўся? Няма. Прымаецца.

Слова для прапазыцыі мае тав. **Аксючыц**.

Тав. **Аксючыц**: Я прапаную абрацъ ганаровы Прэзыдыум Зьезду з наступных таварышоў: **Сталін, Калінін, Рыкаў, Арджанікідзэ, Варашылаў, Молатаў, Тэльман, Пятроўскі Файзула, Мусабекаў, Айтанаў** (гучныя воплескі).

Тав. **Чарвякоў**: Дазвольце паставіць гэтую прапазыцыю на галасаваньне. Хто, папершае, затое, каб ганаровы прэзыдыум абрацъ, і, падругое, каб абрацъ гэтых 13 таварышоў—прашу падняць мандаты. Прашу апусьціць. Хто супроць альбо ўстрымаўся? Няма. Прымаецца аднагалосна (воплескі).

Тав. **Аксючыц**: Ад імя камуністычнай фракцыі Зьезду прапаную абрацъ старшынёю нашага IX Усебеларускага Зьезду Саветаў тав. **Чарвякова** (воплескі).

Тав. **Галадзед**. Хто за тое, каб абрацъ Старшынёй Зьезду тав. **Чарвякова**, прашу падняць мандаты, прашу апусьціць. Хто ўстрымаўся? Няма. Прынята аднагалосна (воплескі).

Тав. **Аксючыц**. Сакратаром Зьезду таксама прапаную ад імя камуністычнай фракцыі абрацъ т. **Хацкевіча**.

Старшыня (Чарвякоў): Дазвольце паставіць на галасаваньне. Хто за тое, каб абрацъ тав. **Хацкевіча** Сакратаром Зьезду, прашу падняць мандаты. Прашу апусьціць. Хто супроць ці ўстрымаўся? Няма. Прымаецца.

Сяляне вітаюць зьезд чырвоным абозам хлеба.

Унечарговую заяву мае т. Аксючыц.

Тав. **Аксючыц**: Таварышы! З пачатку райённых зьездаў Менскай акругі сялянства Меншчыны наладзіла ў знак салідарнасьці яго з савецкай уладай прывітаньне падарункамі чырвоных абозаў хлеба. У Менскім Акруговым Выканаўчым Камітэце ёсьць звесткі, што сяляне таксама падрыхтоўваюць гэтыя чырвоныя абозы і да Ўсебеларускага Зьезду Саветаў, і сёньня сяляне Смалявіцкага райёну ўжо прывезьлі вагон жыта на станцыю Менск і вагон бульбы (воплескі).

Я ад імя Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту прашу прыняць гэты невялікі падарунак. (Воплескі).

Старшыня: У зьвязку з гэтым, слова для прапановы мае тав. **Хацкевіч**.

Тав. **Хацкевіч**. Таварышы. Для прыёму гэтага хлеба і бульбы і для прывітаньня сялян ад імя Ўсебеларускага Зьезду Саветаў я прапаную паслаць делегацыю ў складзе 7-мі таварышоў: т. т. Ігнатоўскага, Драздова (рабочы), Ярашэнка (сялянін Магілеўшчыны), Ермака (чырвонаармеец), Гаварэц (работніца Віцебшчыны), Рачыцкага (Народнага Камісара Земляробства), Бэнэка (Народны Камісар Гандлю) і т. Аксючыца (старшыня Менскага Акрвыканкому).

Старшыня. Дазвольце, таварышы, паставіць на галасаваньне гэтую прапанову. Хто за тое, каб зацьвердзіць гэтую делегацыю, прашу падняць мандаты. Прашу апусьціць. Прымаецца.

Просім абраных таварышоў сабрацца і зараз-жа на машыне паехаць на вакзал, каб прыняць гэты хлеб.

ПРЫВІТАНЬНЕ ЦК УсеКП(б)

Арганізатару вялікага паўстаньня працоўных супроць эксплёататараў, творцу Савецкай Беларусі, адзінаму правадыру і кіраўніку сацыялістычнага будаўніцтва, Усесаюзнай Камуністычнай партыі, у асобе яе Цэнтральнага Камітэту, IX Зьезд Саветаў БССР шле сваё гарачае прывітаньне.

Зруйнаваная імпэрыялістычнай вайной і шматлікімі акупацыямі наша Беларусь змагла ўзьняць сваю гаспадарку і разьвіць сваю культуру толькі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву Камуністычнай партыі і братэрскай дапамозе Вялікага Савецкага Саюзу, неразрыўнай часткаю якога БССР зьяўляецца з першага дню яго стварэньня.

І цяпер, у момант пераможнага наступленьня сацыялізму супроць капіталістычных элемэнтаў на ўсіх франтох гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, рабочыя, сяляне і ўсе працоўныя нашае рэспублікі ня мысьляць сабе іншага шляху да канчатковае перамогі, апрача шляху дыктатуры пралетарыяту, пад кіраўніцтвам сталёвай большавіцкай партыі ў шчыльным эканамічным, культурным і палітычным супрацоўніцтве з братэрскімі савецкімі рэспублікамі нашага адзінага Саюзу ССР.

Цяжкасьці, што паўсталі перад намі і вынікаюць з умоў пэрыяду пачатай поўнай сацыялістычнай рэканструкцыі нашай народнай гаспадаркі, рашучага наступу на капіталістычныя элемэнты і абвостранай, у сілу гэтых прычын, клясавай барацьбы ў краіне, нас не палохаюць. Пад выпрабаваным кіраўніцтвам партыі Леніна, усямерна ўзмацняючы дыктатуру пралетарыяту і абароназдольнасьць Савецкага Саюзу, мы пясьпяхова справімся з усімі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР.

Няхай жыве Усесаюзная Камуністычная партыя бальшавікоў!

Няхай жыве яе Ленінскі ЦК!

Старшыня IX Усебеларускага Зьезду Саветаў А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар IX Усебеларускага Зьезду Саветаў А. ХАЦКЕВІЧ.

8-га мая 1929 г.
гор. Менск.

ПРЫВІТАНЬНЕ ЦК КП(б)Б.

IX Усебеларускі Зьезд Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў пасылае сваё гарачае прывітаньне Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнае Партыі (бальшавікоў) Беларусі, сапраўднаму штабу бальшавізму БССР.

Аглядаючы пройдзены шлях, пад'агульваючы дасягненьні, якія мае БССР за час свайго існаваньня, IX Зьезд Саветаў канстатуе, што вялікія посьпехі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляюцца вынікам напружанай барацьбы і працы рабоча-сялянскіх мас БССР пад кіраўніцтвам Камуністычнай Партыі.

Камуністычная Партыя Беларусі—адзін з баявых атрадаў Усесаюзнай Камуністычнай Партыі-зьяўляецца авангардам і калектыўным правадыром у той вялікай барацьбе і перамогах, якія маюць працоўныя БССР як на франтох узброенага змаганьня за саветы, так і ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

IX Зьезд Саветаў Беларусі зьяўляецца адказнейшым этапам на пераходзе да новай рэканструкцыі эпохі сацыялістычнага будаўніцтва, эпохі вялікіх работ, намечаных пяцігадовым фінансава-прамысловым плянам.

Зьезд адзначае, што працоўныя Савецкай Беларусі, краіны, апаленай пажарамі і аблітай крывёю войн і рэвалюцыі, скончылі адбудову сваей разбуранай гаспадаркі і сьмела перайшлі ў вялікае наступленьне да новых заваёваў на фронце сацыялістычнага будаўніцва, да індустрыялізацыі краіны, да калектывізацыі сельскае гаспадаркі, да культурнага будаўніцтва, уздыму дабрабыту працоўных.

IX Зьезд Саветаў выказвае ўпэўненасьць, што пад кіраўніцтвам Камуністычнае Партыі, пры дапамозе ўраду СССР працоўныя Савецкай Беларусі выканаюць тыя задачы, якія стаяць перад ёю на шляху сацыялістычнага будаўніцтва, ня глядзячы ні на якія цяжкасьці.

Няхай жыве Цэнтральны Камітэт Камуністычнай Партыі Беларусі, кіраўнік працоўных мас Беларусі ў іх барацьбе за пабудову сацыялізму!

Старшыня IX Усебеларускага Зьезду Саветаў А. Чарвякоў.

Сакратар IX Усебеларускага Зьезду Саветаў А. Хацкевіч.

8-га мая 1929 г.
гор. Менск.

Дэлегаткі Зьезду.

ДЗЕНЬНІК ЗЬЕЗДУ

Учора на вячэрнім пасяджэньні камандзір № Беларускай дывізіі т. Лакціёнаў рапартаваў Зьезду аб стане Чырвонаармейцаў дывізіі. Зьезд віталі: т. т. Рубін (дзяржаўная друкарня), Гуейкаў (№ Бел. дыв.), Дабравольскі (завод «Дрэваапрацоўчнік»), Казлоў (АБВШ), Кулікевіч (сялянін Смалявіцкага р.), Хрысьцінін (войск ДПУ), Манахаў і Мінкоў (№ авіёбаза), Каплан (інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі), Гарэцкі (Н-Д. Інстытут), праф. Ніотуховіч, Замбржыцкі, Крывадубскі, Сяргеў, Цьвікевіч, калгаснікі—Дзэскін, Сяргеева, Гавар і інш.

Сёньня на раніцнім пасяджэньні т. Галадзед выступіць з дакладам аб дзейнасьці ўраду БССР.

ДЭЛЕГАТЫ ПРЫЕХАЛІ.

Раніца. Вясна срэбнымі праменьнямі сонца разьлілася па Менску.

Горад прыняў сьвяточны выгляд.

Пралетары Менску сустракаюць сваіх братоў-рабочых і сялян-делегатаў IX-га Усебеларускага Зьезду Саветаў, сустракаюць гаспадароў працоўнай краіны.

Пасажырская станцыя Менску апранулася ў чырвань...

Бадзёрымі, запальваючымі словамі лёзунгаў яна сустракае делегатаў.

Мятусяцца людзі. Клапоцяцца, каб усё было ў парадку, каб чынна бяз сьпешкі, своечасова накіраваць делегатаў на адпачынак, даць магчымасьць падрыхтавацца да зьезду.

Усё робіцца своечасова. Усё на сваім месцы—да сустрэчы гатовы...

Здалёк чуваць гудок магутнага пасажырскага паравоза. Людзі выстраіліся шпалерамі. Чакаюць...

Паравоз весела трухануў клубістай грывай пары...

Трухануў... Задрыжэла зямля... Нешта скрыганула пад калёсамі вагонаў... Працягнае шыпеньне і... цягнік супыніўся. Стаў як укопаны з разьбегу. Яму ня нова, прывычная за шмат гадоў рука машыніста адным рухам супыняе гэты гігант...

Прыехалі делегаты. Вось яны, гаспадары...

Тут Полаччына, Віцебшчына, Аршаншчына, Магілеўшчына. Тут усе акругі Беларусі.

Сапраўдныя гаспадары. Людзі з мазольнымі рукамі. Людзі, якія ўчора на некалькі дзён пакінулі варштаты, трактары і плугі.

Пакінулі таму, што краіна чакае іх—практыкаў, адзіных гаспадароў, дзеля калектыўнага вырашэньня пытаньняў індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі. Яны паставяць вехі на сацыялістычным шляху, вызначаным камуністычнай партыяй.

Праца адказная, цяжкая, але мазольныя рукі, шэрыя сьвіткі, чырвоныя хустачкі палёў і фабрык маюць вялікі шматгадовы вопыт правільна вырашаць пытаньні, беспамылкова, бо на чале іх—КПБ...

Для многіх нечакана перад вачыма вырас прыгожы вялікі будынак чыгункі. Той будынак, які 10 год таму назад быў узорам беларускіх „жартаў" у Менску.

Той будынак, які паны ўзарвалі дзесяткамі пудоў дынаміту пры адступленьні.

Ён сягоньня лепшы, чым калісьці. Новеньки, чысьценькі, прыгожы...'

— Зусім не пазнаю Менску,—кажа адна делегатка.—Такая аграмадзіна за кароткі пэрыяд часу...

— Году няма, як я быў у Менску, а зараз—на табе... Добры падарунак...

— Вось што значыць наша, савецкая руплівасьць; з ёю нідзе не прападзеш...

— Нас паны не запалохалі разбураным Менскам,—кажа адзін з сустракаўшых,—мы з яго старога робім новы Менск.

— Мы з старой Беларусі стварылі новую, Савецкую...

Машыны развозяць делегатаў у падрыхтаваныя памяшканьні.

Зьлева відаць лес рыштаваньняў, дзе на былым пустыры дзень за днём расьце Унівэрсытэцкі гарадок.

Абапал вуліцы ляжаць спаяныя рэйкі будучага трамваю.

Весела гудуць аўтабусы... Менск жыве магутным жыцьцём.

Сэрца Беларусі—за выкананьнем дадзеных 8-м зьездам дырэктыў.

Пасьпяховае выкананьне іх відочна... Заводы і фабрыкі вянком абкружылі горад.

Дзесяткі новых фабрычных трубаў клубамі чорнага дыму сьведчаць, што будуецца новае жыцьцё па загаду мінулых зьездаў.

Пасьпяховасьць будаўніцтва будзе праверана.

Ул. Лампэцкі.

8-V—29 г.
Менск.

Першамайскія падзеі ў Нямеччыне---

СПРАВА РУК САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТАЎ.

Бурныя спрэчкі ў рэйхстазе аб бэрлінскіх падзеях.

„Сац.-дэм. высока цэняць учынкі паліцыі".

БЭРЛІН, 7-5. У бюджэтнай камісіі рэйхстагу адбыліся сёньня бурныя спрэчкі аб бэрлінскіх падзеях. Камуністычны дэпутат Маслоўскі выступіў з прамоваю, у якой заявіў: „Той факт, што Зэвэрынг на выступіў супроць забароны першамайскіх дэманстрацый, сьведчыць аб тым, што ў клясавай барацьбе сацыял-дэмакратыя далучылася да блёку, накіраванага супроць пралетарыяту. Сацыял-дэмакратычны міністр унутраных спраў узброіў паліцэйскіх і падрыхтаваў іх для грамадзянскай вайны. Забарона чырвонага саюзу франтавікоў зроблена дзеля таго, каб неяш закончыць торг, які ідзе ў Парыжы, і прадэманстраваць сваю варожасьць да бальшавізму. Усё тое, што гавораць аб узброеньні камуністычных дэманстрантаў, байкі. Барыкады былі пабудаваны ў якасьці меры абароны супроць панцырнікаў. Паліцыя страляла кулямі дум-дум. Адказнасьць за гэтыя крывавыя бойні усіладаецца на сацыял-дэмакратыю і яе міністра унутраных спраў". Пасьля выступленьняў прадстаўнікоў нацыяналістаў і сацыял-дэмакратаў, якія ўхвалілі як паводзіны паліцыі, так і забарону першамайскай дэманстрацыі, прычым прадстаўнік нацыяналістаў выказаў пажаданьне аб ужываньні яшчэ больш суровых рэпрэсій супроць камуністаў, выступіў з прамоваю Зэвэрынг. Зэвэрынг цалкам ухваліў паводзіны паліцыі і ўраду і заявіў, што калі гавораць „аб забойстве рабочых драбантамі Цэргібеля, дык ён, Зэвэрынг, заўляе, што „высока цэняць эдэльмэнцы берлінскай паліцыі і шкадуе, калі яе не дацэняць". Калі,—заявіў далей Зэвэрынг,—адбыліся некаторыя перагібы, дык адказнасьць за гэта ўскладаецца на інтэлектуальных пачынальнікаў падзей, а іменна на камуністычную партыю. Задача дзяржавы ў тым, каб ізаляваць камуністаў. Гэта задача ня была-б выканана, калі-б ня былі ўжыты ўсе меры, аб якіх гавораць, але было-б гаўнствам распусьціць кампартыю. Забарону толькі тады можна выдаваць, калі яе можна ажыцьцёвіць.

Дэманстрацыі пратэсту ня спыняюцца.

ВАРШАВА, 7-5. Па закліку камуністаў у Данцыгу адбылася дэманстрацыя салідарнасьці данцыгскіх рабочых з берлінскім пралетарыятам. У часе дэманстрацыі здарылася сутычка з паліцыяй. Дэманстранты актыўна абараняліся. Пры сутычцы паранена больш 20 асоб з абодвых бакоў. Паліцыя арыштавала дэпутата сойму, камуніста Плянікоўскага, аднак, дэманстранты вызвалілі яго. Тэльні поэна Ўсочары паліцыі ўдалося зноў арыштаваць Плянікоўскага і іншых.

Пахаваньне ахвяр сацыял-дэмакратычнае паліцыі.

БЭРЛІН, 7-V. У зьвязку з надыходзячым заўтра пахаваньнем некаляіх ахвяр паліцэйскага тэрору ў першамайскія дні, берлінскі першамайскі камітэт заклікае рабочых Бэрліну спыніць заўтра працу на паўгадзіны ад 13 гадз. 30 хвіл. да 14 гадзін.

Трансвартная рабочыя спыняюць працу на 5 хвіл., пачынаючы ад 14 гадз. Прадпрыемствы пасылаюць на пахаваньне свае дэлегацыі. Для ўдзелу ў пахаваньні з Гамбургу прыехала дэлегацыя з 20 рабочых. Дэлегацыі з Саксоніі і іншых мясцовасьцяй краіны ўжо выехалі.

Паліцэй-прэзыдыум выдаў сёньня сваякам ці сы 11 забітых для пахаваньня. Аднак, паліцэй-прэзыдыум не дазволіў наладзіць пахаваньне забітых з ініцыятыўнасьці МОПР'у ці з больніц, або з партыйнага дому К. Лібкнэхта.

УСЕ ЗАБІТЫЯ Ў БЭРЛІНЕ ЗАГІНУЛІ АД РУК ПАЛІЦЭЙСКІХ.

БЭРЛІН, 7-5. „Ахт Ур Абэндблят" паведамляе аб выніках уснрыцьця трупаў масьля майскіх падзей. Водлуг гэтых вынікаў, устаноўлена, што ўсе забітыя загінулі ад стрэлаў паліцыі, і ня было ніводнага выпадку, каб прыватная асоба страляла ў паліцэйскага. Адзіны паліцэйскі, яні атрымаў агнастрэльную рану, відавочна, параніў сам сабе. Газэта патрабуе дакладнага сьледзтва па справе паліцэйскіх, на якіх ускладаецца адказнасьць за забойства

„Выходзьце з шэрагаў сац.-дэмакратыі"

БЭРЛІН, 7-5. Першамайскія падзеі ў Берліне і паводзіны паліцыі выклікалі хвалю моцнага абурэньня з боку рабочых ва ўсёй Нямеччыне. Гэта абурэньне выявілася ў магутных масавых дэманстрацыях на ўсіх значных гарадох Нямеччыны, Пачаткі настрой рабочых на прадпрыемствах выявіўся ў пастанове будаўнічых рабочых на прадпрыемствах „Кустас" у Гурскай вобласьці. У гэтай пастанове гаворыцца: „РАБОЧЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ЗВАРОЧВАЮЦЦА ДА ЎСІХ РАБОЧЫХ З ЗАКЛІКАМ І ЗАЗНАЧАЮЦЬ, ШТО НІВОДЗІН СУМЛЕННЫ ЧАЛАВЕК ЯК МОЖА БОЛЬШ ЗАСТАВАЦЦА ЧЛЕНАМ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, ВЫХОДЗЬЦЕ З ШЭРАГАЎ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТАЎ І ПЕРАХОДЗЬЦЕ Ў ШЭРАГІ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ".

Хочуць прыдушыць камуністычны друк.

ВЭРЛІН. 7-V. Пасьля забароны цэнтральнага органу кампартыі „Ротэ Фанэ" зараз-жа распачаліся прасьледаваньні таксама і правінцыяльных газэт. Так, напрыклад, у Магдэбургу забаронена камуністычная „Трыбуна".

Загад аб роспуску Саюзу Чырвоных Франтавікоў.

БЭРЛІН. Агенцтва Вольфа паведамляе: «Водлуг поўных вестак, саксонскі ўрад выдаў сёньня загад аб роспуску Саюзу Чырвоных Франтавікоў у Саксоніі. Урад Ангальта заявіў, што ён не намеран распускаць саюз».

* * *

БЭРЛІН, 7-5. Згодна прапановы Зэвэрынга, Гамбурскі сэнат выдаў загад аб роспуску Саюзу Чырвоных Франтавікоў.

* * *

БЭРЛІН 7-V. У зьвязку з роспускам Саюзу Чырвоных Франтавікоў шмат-лікі былі ўчынены вобыскі ў памяшканьнях саюзу, а таксама ў памяшканьнях кампартыі. У Гале, Кёльне, Кенігзбэргу, Эсэне і іншых гарадох памяшканьні франтавікоў заняты вялікімі атрадамі паліцыі.

„Саюз франтавікоў не дапусьціць свайго роспуску".

БЭРЛІН, 7-5. Учора ўвечары выйшаў другі нумар нелегальнае «Ротэ Штурм Фанэ» (якая выпускаецца замест „Ротэ Фанэ"). Газэта піша наконт роспуску Чырвонага саюзу франтавікоў так: „Прускі міністр унутраных спраў сацыял-дэмакрат Грэзэзінскі і агульнанямецкі міністр унутраных спраў сацыял-дэмакрат Зэвэрынг забаранялі Чырвоны союз франтавікоў, бо ён на сваім сьцягу напісаў лёзунг—абарона СССР. Але саюз не дапусьціць свайго роспуску. Нам напляваць на забарону Грэзэзінскага і Зэвэрынга. Для рабочых Чырвоны саюз франтавікоў не распушчан. Пралетарскія баявыя арганізацыі захоўваюць свае згуртаваньня шэрагі".

Арышты ўдзельнікаў дэманстрацый.

БЭРЛІН, 7-5. З ліку 117-ці асоб, перасланых да судзьдзі ў зьвязку з майскімі непакоямі, 45 асоб судзьдзя загадаў арыштаваць, абвінаваціўшы іх у парушэньні грамадзкага спакою, паўстаньні, супраціўленьні ўладзе і пагрозьбы іншых. Рэшта—выпалены.

Выразны адказ рабочых рэфармістам.

БЭРЛІН, 4-5. У Гамбургу на суднабудаўнічых вэрфях адбыліся паўторныя перавыбары фабзавкому, бо рэфармісцкае кіраўніцтва прафсаюзаў скасавала першыя перавыбары ў зьвязку з дасканалай перамогай, атрыманай рэвалюцыйным крылом прафсаюзаў. За сьпіс рэвалюцыйнага крыла галасавала 4.110 рабочых—супроць 3.450 на першых выбарах. Сацыял-дэмакратычны сьпіс атрымаў 2.670 галасоў.

У Саюзе ССР.

Адчыненьне Ўсеукраінскага Зьезду Саветаў.

ХАРКАЎ, 8-5. Адчыніўся 11-ты Усеукраінскі Зьезд Саветаў у прысутнасьці прадстаўнікоў чужаземных місій і консульстваў.

Зьезд адчыніў старшыня Усеукраінскага ЦВК тав. Пятроўскі, які паведаміў зьезду аб прыезьдзе прадстаўніка саюзнага ўраду тав. Куйбышава.

5-ты Закаўкаскі Зьезд Саветаў.

ТЫФЛІС, 8-5. Учора адчыніўся 5-ты Закаўкаскі Зьезд Саветаў. Зьезд адчыніў старшыня Закаўкаскага ЦВК тав. Цхакая.

Дэлегацыя гарнякоў у тав. Сталіна.

МАСКВА, 7-5. 4-га мая дэлегацыя гарнякоў Донбасу ў колькасьці 170 чалавек была прынята Сталіным. У гутарцы, якая цягнулася 2 з паловаю гадзіны, т. Сталін адказваў дэлегацыі на шэраг пастаўленых яму запытаньняў, якія датычаць міжнароднага становішча, пяцігодкі, пытаньня аб правай небясьпецы, а таксама пытаньняў матар'яльна-бытавых і культурных бакоў жыцьця рабочых Данбасу. Пасьля гутаркі дэлегацыя дала т. Сталіну абяцаньне выканаць цалкам задачы, пастаўленыя перад гарнякамі савецкай уладай у пляне пяцігадовага будаўніцтва.

ЦК УсеКП(б) аб разьвіцьці тэкстыльнае прамысловасьці.

МАСКВА. ЦК УсеКП(б) 3 мая г. г. вынес шырокую пастанову аб становішчы і пэрспэктывах тэкстыльнае прамысловасьці.

Пастанова адзначае спрыяючыя ўмовы разьвіцьця і шпаркі рост тэкстыльнае прамысловасьці, ня гледзячы на шэраг адмоўных фактараў, як зношанасьць і застарэласьць абсталяваньня, недастаткова сыравінная база, адсутнасьць адпаведных інжынэрна-тэхнічных кадраў і г. д. Пастанова намячае ўнутраньнае ў вытворчасьць новых кадраў рабочых, сыстэматычнае павялічэньне зарплаты, перавод на 7-гадзінны рабочы дзень звыш 160 тысяч рабочых і шэраг нарспэктыў далейшага росту, што высоўвае разам з тым на першы плян задачы яначнага палепшаньня тэкстыльнае прадукцыі.

Пастанова ЦК асабліва падкрэсьлівае неабходнасьць перамаганьня найбольш „вузкага" месца ў тэкстыльнай прамысловасьці, іменна—не сыравінай базы, шляхам пашырэньня кантрактацыі і калектывізацыі, узмацненьня іррыгацыйных работ для новых пасеўных плошчаў узьнікцьця ўраджайнасьці бавоўны, узмоцненага вытворчага каапэраваньня сялян выпрацоўваючых бавоўну, калектывізацыі сельскай гаспадаркі і інш. Неабходна распрацаваць шэраг мерапрыемстваў, стымулюючых рост аўтаводства, льнаводзтва, разьвядзеньня новых тэкстыльных культур, разьвіцьцё вырабу штучнага валакна і інш.

Пастанова падкрэсьлівае культурны ўздым і рост матар'яльнага дабрабыту шырокіх мас, які выклікае попыт насельніцтва, што дыктуе неабходнасьць далейшага росту рэканструкцыі тэкстыльнай прамысловасьці на тэхнічна-больш удасканаленай базе, павялічэньня разьмеру капітальных укладаньняў, большай плянавасьні работы, шырокага скарыстаньня навукова-тэхнічнай думкі савецкіх тэхнікаў, вызваленьня дасьпіваючых і новых прадпрыемстваў ад залежнасьці ад замежнага абсталяваньня.

Цэнтральнай задачай сёлетняга году і бліжэйшых год зьяўляецца зьніжэньне сабекошту прадукцыі.

Для перамаганьня недахвату кадру тэхнічнага пэрсаналу зазначаецца на неабходнасьць пашырэньня тэкстыльнага інстытуту максымальнага скарыстаньня іншых ВТНУ ў справе падрыхтоўкі спэцыялістаў, арганізацыі шырокай сеткі курсаў для падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі сярэдняга і ніжэйшага пэрсаналу, палепшаньня арганізацыі фабрычна-заводзкага вучнёўства, узмацненьня вытворчага выхаваньня і перападрыхтоўкі старых кадраў рабочых. Таксама неабходна павялічыць асыгнаваньні на ясьлі, лазьні, прачашныя, школы, больніцы, клюбы, адначасова наладжваючы жыльлёвыя ўмовы рабочых-тэкстыльшчыкаў.

Пастанова ЦК УсеКП(б) прызнае неабходным, каб ВСНГ і ЦК тэкстыльшчыкаў на гэтай падставе распрацавалі дэтальныя дырэктывы аб правядзеньні ў жыцьцё практычных мерапрыемстваў.

Разьвіцьцё ільнаводзтва павялічыць прыбытковасьць сялянскай гаспадаркі.

МАСКВА, 7-5. Адчынілася сэсія саветаў ільнацэнтру. З дакладам аб пэрспэктывах разьвіцьця ільнаводзтва выступіў старшыня праўленьня ільнацэнтру т. Хромін, які зазначыў, што водлуг пяцігадовага пляну, намечана пашырыць засевы лёну на 48 проц., канаплі—на 16 проц.; ураджайнасьць павысіць—па лёну—на 46 проц., па канаплі—на 12 проц. Значна павялічваецца прыбытковасьць сялянскай гаспадаркі ад ільнаводзтва. Роля аграмаднага сэктару значна ўзрастае. Лік калгасаў мяркуецца павялічыць з 1500 да 17000, лік пасеўных таварыстваў з 1500 да 24000 і лік таварыстваў па хімічнай апрацоўцы лёну—з 400 да 3760 і г. д.

Дзяўчыны—на кіруючую камсамольскую працу

ЦК УсеЛКСМ пастанавіў вылучыць шэраг дзяўчын на кіруючую камсамольскую працу ў цэнтральных і мясцовых арганізацыях. Тав. Усьцінава, вылучана намесьнікам Заг. АПА ЦК УсеЛКСМ, тав. Васільлева—намесьнікам Заг. Аддзелу Працы і асьветы ЦК УсеЛКСМ, т. т. Растаргуева, Карпычава і Чарняева — сэкратарамі акркомаў УсеЛКСМ у Івана-Базьнясенскай, Ніжагародзкай і Заходняй вобласьцях. Апрача таго, шэраг дзяўчын вылучана на пасады загадчыц аддзеламі і членаў Аргбюро абласных камітэтаў УсеЛКСМ.

Барацьба з басмачамі на аўгана-савецкай граніцы.

ДЗЮШАМБЭ, 7-5. У зьвязку з апошнімі падзеямі ў Аўганістане ў працягу другой паловы красавіка ўзмоцніўся пераход басмацкімі бандамі аўгана-савецкай граніцы.

Паміж 20 і 22-м красавіка дзьве банды, перайшоўшы граніцу, накіраваліся ў глыб Таджыцкай ССР, рабуючы мясцовае насельніцтва і нападаючы на салецкія ўстановы. Высланыя часьці Чырвонай арміі гэтыя банды частковa зьнішчылі, а частку прымусілі накіравацца на поўдзень.

28-га красавіка граніцу перайшла новая буйная банда ў складзе 300-400 басмачоў, на чале з вядомым старым басмацкім кіраўніком Файзулай (прыяцелем і саратнікам Ібрагім-бэка).

У раёне на поўдзень ад гораду Гарма гэта банда сустрэлася з выкліканымі атрадамі Чырвонай арміі і, ня прыняўшы бойкі, схілілася на ўсход. У раёне на поўнач ад Калай-Хумб 30-га красавіка нашы часьці мелі сутычку з другой бандай басмачоў, якая, водлуг слоў палонных, зьяўляецца перадавым атрадам новай буйнай банды, якая рыхтуецца да нападу на тэрыторыю СССР на чале з Ібрагім-бэкам. Ваенным камандаваньнем ужыты захады да ліквідацыі гэтых бандаў.

ЗАЎВАГА: Ібрагім-бэк зьяўляецца вядомым кіраўніком басмачоў, які ў 1924-25 г. узмоцнена дзейнічаў у межах сярэдня-азіяцкіх савецкіх рэспублік. Пасьля разгрому яго банды ён хаваўся ў межах Аўганістану.

Па Беларускай С

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Перавыбарчая кампанія ў спажы кай каапэрацыі.

(*Ліст з Бабруйску*).

Перавыбары кіруючых і рэвізійных органаў спажывецкае каапэрацыі на Бабруйшчыне падыходзяць да канца. Праз тыдзень яны будуць закончаны, і ўжо зараз магчыма ацаніць агульнае становішча гэтае работы.

Перад пачаткам перавыбараў на акрузе была праведзена значная падрыхтоўчая работа спосабам правядзеньня сходаў беднаты, жаночых сходаў моладзі і г. д. Такім чынам, асноўны кадр сялянства быў ужо ў курсе справы па перавыбарах каапэрацыі і ў курсе тых пытаньняў, якія падлягалі разгляду на перавыбарчых сходах.

Прысутнасьць пайнікаў на агульных раённых сходах дасягае 67 проц. На гэтых сходах сяголета прысутнічала значная доля жанчын (да 67 проц), чаго ня было ў мінулыя гады. Сходы адзначаюцца вялікарнай актыўнасьцю з боку бядняцка-серадняцкай часткі вёскі. Гэта актыўнасьць, надмацаваная дзелавою крытыкаю, надае сходам самы дзелавы і сур'ёзны характар. Чырвонаю рыскаю ў выступленьнях на сходах праходзяць скаргі на тое, што спажывецкая каапэрацыя стаіць нібы ў баку ад справы па ўдзяльнасьці ўраджайнасьці, не дапамагае сялянству ў гэтым, занадта ўжо захапіўшыся гандлёваю дзейнасьцю, а культурна-масавае работы амаль што зусім не вядзе.

Мае месца на сходах пайнікаў і кулацкая актыўнасьць. Яна праходзіць пад арыгінальным дамаганьнем „аб'яднаць усе віды каапэрацыі ў адзін, каб пайнік", дамаганьнем «абіраць у органы каапэрацыі заможных за кошт іх гаспадарак можна ваць растраты" і г. д.

Пытаньне аб дыфэрэнцыя сустракае сярод пайнікаў спа апэрацыі падтрыманьне і на праходзіць і крымаецца да пр жыцьцё.

Бядняцка-серадняцкае сяля сачыць за чыстатою шэрагаў рэвізійных органаў спажывецкі цыі. Папярэднія вынікі перав спажывецкаму таварыству пакі ў склад праўленьня абрана проц., батракоў—7 проц., бе проц. і серадняку 23 проц. У складзе пераабраных праўлень ны займаюць 20 проц. Партыйн мольскі склад новых праўлень 50 проц.

Што датычыцца складу рэві сій, дык склад іх да некатор розьніцца ад складу праўлень вінных камісій яшчэ і да гэта ла ўпягнута батракоў, серадня чын.

У некаторых мясцох акругі тыйных, савецкіх і грамадзк цый было мала аддадзена ўвагі чай рабоце ў спажывецкай Пра гэта адзначаўся па жывецкіх таварыствах слабы каў у перавыбарах.

А.

Плян кантрактацыі выканалі.

(Рагачэўскі р-н, Бабруйшчына).

Па лініі сельска-гаспадарчай каапэрацыі шырока разгорнута кантрактацыя пасеваў. Асабліва ў гэтай працы вызначаецца Цхінскае с-г. крэдытнае т-ва, якое абслугоўвае 5 сельсаветаў.

Да гэтага часу праведзены сходы наконт кантрактацыі амаль што па ўсіх вёсках, дзе сялянства ахвотна адгукнулася на гэта мерапрыемства савецкай улады, асабліва сялянства Асаўнікскага сельсавету, дзе ёсьць цэлыя вёскі, якія закантрактавалі пасеў аўсу, і ўжо плян кантрактацыі аўсу выканан больш чым на 100 проц.

Другой культурай, якая кантрактуецца, ідзе лён на насеньне, дзе плян выконваецца і трэба сказаць, трактацыя ільну найбольш для селяніна.

Іншыя культуры слаба кан ца, дзякуючы нейкай сялянства, як канюшына, інш., дзе трэба кредытнаму весьці больш падрабязнае так як у сувязі з недахопам гэтых культур—кантрактацы абходна.

Я. Кру

Арганізуем калгас.

Яшчэ ўвосень 1928 году, калі правадзілі ў Танескім сельсавеце, Тураўскага райёну землянадзяленьне, адвялі ў вур. «Бабан» пад калгас каля 200 гэктараў зямлі. У гэтым годзе Танескі с-савет канчаткова прыступіў да арганізацыі гэтага калгасу.

Ужо некалькі раз перавяйка скліканая сходы беднаты і сходы арцелаў, на якіх абгаварвалі пытаньне аб арганізацыі калгасу; але гр-не ў Танескі адмаўляюцца ісьці ў калгас, тлумачачы гэта тым, што ня хочуць вымарчоўваць пні. Толькі яўрэйскае насельніцтва ў ліку сямі гаспадароў дабрахвотна ідзе ў калгас.

Тураўскі РВК дапамагае ў зацыі калгасу ў вур. «Бабан

Член РВК на сходзе яўрэя ючых ісьці ў калгас, а такі сходзе беднаты заявіў, што м рэяў м. Турава згодзіцца пайс гас у вур «Бабан».

Калі складалі пахаз новаму дык унесьлі пункт, каб абаз ганізаваць у вур. «Бабан

Ёсьць надзея, што ў вур. будзе арганізован яўрэйскі ка давядзе сялянам, што яўрэі ніякіх затрудненьняў могуц ваць на зямлі.

С. Шо

Злачынствы ў Савініцкім каапэрат ня спыняюцца.

(Клімавіцкі р., Мазыршчына).

Савініцкі спажывецкі каапэратыў на дрэнай глебе пабудаваны ці каапэрацыйныя працаўнікі на гэтакай выраслі,—толькі ў ім нешта ня ладзіцца.

З самага пачатку яго існаваньня недахопы паганяліся растратамі і ў крамах і ў скарбніках, а што ў ім здарылася ў гэтым гаспадарчым годзе, дык і пісаць сорамна; адзін старшыня праўленьня—Капылоў прысвоіў 886 р. 69 к., а другі—Сілкін—158

Першы ўжо засуджан на выяволеньня і выключан а злачынства другога толь савіка г. г. афіцыйна выкры камісіяй з нарсьледчым; трэ вацца, што і ён панясе нале ру, а таксама будзе зьняты сакратара ячэйкі КП(б) і ві з партыі.

Пай

Нішчаць лес.

(Прудзішчанскі с.-с. Астр.-Гарадзецкага райёну).

Стыхійна нішчаць лес у Закрынічкім вобчастве нашага сельсавету. Дзякуючы вымене лясьніцоў, якіх за адзін год было 3, сялянства мае самыя шырокія магчымасьці самадумна і безадказна нішчыць лес.—Цяпер, праходзячы па лесе, можна бачыць як бліскаць лясінамі ніві самадумна пасечаных бяроз.

Лясьнік Шастаковіч Андрэй, які праслужыў усяго 1 месяц, заставіў аб сабе дрэнную памятку, ён складаў пратаколы на суседзяў, а ня бачыў як сек бярозы яго бацька.

Сельсавет таксама не клап ахове лесу і ні разу не заслу справаздача лесагаспадарчай нашага вобчаства.

Сялянства, гледзячы на так дараньне, кажа:—«Калі ў д будзе так нішчыцца лес, то ціць ня болей як на 3 гады».

Перадача аховы лесу ад адн ніка другому робіцца бяз ніяк і праверак, а так сабе—на во

Се

Фэльетон.

ЛУДАРВАЙ у МАКРАДЦЫ.

Дорога была гразкая і топкая. Стомлены каняка ледзь-ледзь цягнуў парожнія калёсы. „Экіпаж" па ступіцы ўрэзваўся ў разбухшую зямлю, накідаючы за сабою глыбокую баразду-канаву.

Гаспадар канякі, такі-ж заморан і спацелы, 60-цігадовы старык Раманаў Малах, ішоў усьлед за падводаю. Вясна падвязала да лапцяў кайданы цяжкага бруду, так што яны чапляліся курцамі адзін за другі, перашкаджаючы ісьці і без таго страціўшаму апошнія сілы селяніну.

Вясеньная цялынь, чарнарабочыя гракі, рассыпаная ў паветры песьня жаваранкаў і дарога якая магнэсам ліпкай гразі прыцягвае стомленыя ногі,—усё нараджае клапатлівыя думкі аб надыходзячай сяўбе. Разам з меркаваньнямі аб рабоце ўспліваюць цьмяныя ўспаміны аб сыне, які вучыўся на рабфаку, друкаваў у часопісах вершы і ґраптам, расьцвечаны ўзыходзячай славай, памёр трагічнай сьмерцю...

На двары яго спаткалі: старшыня сельсавету Ладзес, старшыня камітэту узаемадапамогі і яшчэ нейкія невядомыя грамадзяне. Раманаў даведаўся, што яны прышлі спагнаць з яго грошы на выканаўчым лісту ў карысьць аднавяскоўца Бічукова Лукаша.

Хата аказалася замкнёнай, так што ні старшыні сельсавету, ні самому гаспадару ўвайсьці ў яе ня было ніякай магчымасьці. Селянін прасіў „гасьцей" пачакаць прыходу гаспадыні, якая забрала з сабою ключы, але прадстаўнікі рэвалюцыйнай законнасьці ніяк не маглі згадзіцца пайсьці пад уплыў дробнабуржуазнай стыхіі" ды яшчэ ў такі зручны момант, калі для сьмеласьці і больш вытрыманай «клясавай лініі» напярэдадні было выпіта тры пляшкі віна саматужнай вытворчасьці грамадзяніна Бічукова...

Ногі ў іх дрыжалі ад залішняй энэргіі, рукі нэрвова перабіралі выканаўчы ліст, а п'яныя вочы, з агонькамі нахлынаўшай злосьці, пільна ўглядаліся на замкнёныя дзьверы.

А тое, што здарылася пасьля, зрабіла ўражаньне разарванай бомбы. З п'янымі крыкамі—„грамі"! „крышы"! —мясцовая ўлада накінулася на Раманава, паваліла яго на зямлю, сякерай разламала дзьверы і гэрсем накіравалася ў хату.

— Браткі! Таварышы!.. Што вы робіце?—бездапаможна прасіў Раманаў п'яных граміл.

У адказ на просьбу яго зьявязалі вяроўкай, як злачынцу ці разбойніка; кулакамі—глухімі і важкімі як волава, білі па шасьцідзесяцігадовым слабым целе, а потым, калі Раманаў у непрытомнасьці крыкнуў балючае—„Ратуйце"!—ніхнулі, як непатрэбны баляст, або трэн скапаўшай жывёлы ў сенцы, залітыя брудная вясеньняй вадой.

Пасьля ўдалай перамогі з лаянкай і зыкам наморшчаных дзяржымордаў урываюцца ў хату і імем рэвалюцыйнай законнасьці ломяць куфры, выцягваюць стракатыя андракі, вышываныя кашулі, самацканыя палсы. Засленка са звонам ляціць з ночы, а за ёю скаваароды, чыгуны, гаршкі, міскі. Старшыня Камітэту Узаемадапамогі са сьнехам вор'ята выкідае на вуліцу дзіцячую калыску з пялёнкамі і падушкай. Хтосьці абухам разьбівае замок у клеці і выграбае апошняе збожжа з засекаў...

Прышоўшы да прытомнасьці, Раманаў узьняў гвалт, на які сабралася амаль што ўся вёска. Адны радуюцца, бо ведаюць, што гэта моцны аргумэнт у агітацыі супроць савецкай улады; другія пратэстуюць, крычаць, патрабуюць спыненьня зьдзекаў над селянінам; трэція, найбольш бабулі з старыкі, шкадуюць суседа Малаха і ўспамінаюць чорныя часы прыгону...

Пасьля выкананьня „службовых абавязкаў" экспэдыцыя дзяржымордаў некалькі гадзін рабіла тайнае насяджэньне. Выканаўшы сваю „справу", кампанія, працьвярозіўшыся, стала перад практычным і хвалюючым запытаньнем:

— Што рабіць? Як загладзіць няпрыемнае здарэньне?

Ня ведаем, аб чым яны там гаварылі і які выпрацавалі плян дзейнічаньня, але праз тыдзень Раманаў атрымаў позву зьявіцца ў Чавускі суд. Там сустрэў ён абодвых старшынь і сьведак, што прымалі ўдзел у зьбіваньні яго. Суд зачытаў пратакол, складзены на яго сельсаветам „за супраціўленьне ўладзе ў часе выкананьня апошняю службовых абавязкаў".

Са сьлязамі на вачох Раманаў даказваў, што гэта няпраўда, што сельсавет аманкаў суд, што ня ён, а яны павінны сесьці на лаўку падсудных, што ў пацьвярджэньне гэтага ён можа сьведкамі прывесьці палову вёскі.

Вядома, суд паслухаў селяніна, паверыў яму і яго сьведкам; суд абараніў слабога шасьцідзесяцігадовага старыка; суд пакараў савецкіх дзяржымордаў і...

Прысудзіў Раманава на два месяцы прымусовых работ...

Суд з лёгкадумнасьцю сял гадовага юнака ўзаконіў савец доксамі і артыкуламі ня толь ствам, «як такавое», але зьяв селянінам, сьвядомае апуска вецкіх органаў, з мэтай замес ды злачынства і, наогул, дзя даў і лударвайскіх прысьпешн

Раманаў нутром усім істо ваў фальш пастановы Чавуск Нешта падказвала, што на Чавусах сьвет клінам ня зы што людзі ў другіх гарадох падобныя да чавускіх Капіто

Нязграбным почаркам напіс гу, абвеянную шчырай надзеі памогу. Скаргу з Масквы накі Менск, адтуль—у Магілеў, з —у Чавусы. Дасьледаваць спра хаў сьледчы ў Макрадку. Д дзіўся з старшынёю сельсавет тым паклікаў Раманава да ся пытаў:

— Цябе вязалі?

— Вязалі.

— І моцна білі?

— Моцна.

Сьледчы апусьціў галаву, вочы ў паперы, што ляжалі п а потым мякка, як таварыш з шам, як роўны з роўным адка

— Так вам і трэба!

Ласкавыя словы сьледчага нам распаўленай лавы аблілі ва. Дзе праўда? Праўда дзе???

Страціўшы надзею знайсьці Раманаў зьвярнуўся да нас: дапамогі толькі ад «Савецкай сі».

Так. Мы дапамажам. У нас моцы вызваліць здаровы савец рат ад фармалістаў-судзьдзяў і вайскіх прысьпешнікаў!

Праўду знойдзем, таварыш Р

Цім. Заро

У ПОЛЬШЧЫ.

Амэрыканскі фінансавы дарадчык аб становішчы ў Польшчы.

ВАРШАВА, 7-5. Амэрыканскі фінансавы дарадчык у Польшчы Дзюі агалосіў частку свайго дакладу аб эканамічным і фінансавым становішчы за першы квартал бягучага году. Дзюі ў сваім дакладзе зазначае на неабходнасьць захаваньня крайняй эканоміі ў выдатканьні дзяржаўных сродкаў, скарачэньня ўкладу гэтых сродкаў у прамысловасьць і будаўніцтва. Далей Дзюі лічыць неабходным «узмацніць падатковую сыстэму». У сваім дакладзе Дзюі падкрэсьлівае, што залатое забясьпечаньне польскай валюты падтрымліваецца ў значнай меры кароткатэрміновымі крэдытамі.

Застой у будаўнічай прамысловасьці.

ВАРШАВА. Пачатак будаўнічага сэзону адзначыўся па ўсёй Польшчы вядомым застоем, які выклікае вялікую трывогу сярод рабочых-будаўнікоў. Саюз будаўнікоў гораду Станіславова яшчэ ў сакавіку накіраваў дэлегацыю да валводы з хадайніцтвам выдаць крэдыты на будаўніцтва, аднак, гэтае хадайніцтва да гэтага часу ня мела ніякіх вынікаў. Рабочыя-будаўнікі Асаўца на сваім сходзе ўхвалілі такую пастанову:

«Сход будаўнічых рабочых адзначае, што будаўнічы сэзон у Асаўцы зусім не распачаўся, і што рабочыя будаўнікі пасьля доўгае цяжкае зімы застаюцца ў вялікай пакуце». Рэвалюцыя заклікае мясцовыя органы асыгнаваць сродкі на будаўніцтва, а рабочых—шчыльней згрупавацца для абароны сваіх правоў.

Дух польскай рэспублікі.

ВАРШАВА. Варшаўскі магістрат пастанавіў разаслаць усім падначаленым яму ўстановам і прадпрыемствам цыркуляр, якім забаранае праводзіць аплату за дзень 1-га мая тым рабочым і служачым, якія ў гэты дзень не працавалі.

На тым-жа пасяджэньні магістрат абмеркаваў пытаньне аб субсыдыі на скончэньне пабудоў касьцёлаў з тае прычыны, што апошнія «ня могуць абыйсьці» сябе такімі выдаткамі. Магістрат пастанавіў выдаць 6 касьцёлам субсыдыю ў 6.000 руб.

Муніцыпальныя выбары ў Францыі

Перамога камуністаў на выбарах.

ПАРЫЖ, 7-5. На муніцыпальных выбарах у Парыжы пры першым галасаваньні абрана 16 кандыдатаў правых партый, 17 кандыдатаў лева-буржуазных партый, 2 сацыялісты і 5 камуністаў.

Перагаласаваньне будзе праводзіцца ў 36-ці выбарчых раёнках. Камуністы ў Парыжы сабралі 107.593 галасы (на мінулых выбарах—98.695 галасоў).

ПАРЫЖ, 7-5. Згодна папярэдніх падлікаў на муніцыпальных выбарах у Парыжы камуністы атрымалі 21 проц. усіх пададзеных галасоў (107.646), а сацыялісты—19 проц. (89.339). Водлуг слоў «Юманіта», міністэрства ўнутраных спраў ужывае ўсе захады, каб заснаваць пры перагаласаваньні ў валіцах адзіны антыкамуністычны фронт усіх партый з удзелам сацыялістаў.

ПАРЫЖ, 7-5. У дэпартаманце Поўначы пазіцыя кампартыі значна ўзмацнілася. Сьпісы рабоча-сялянскага блёку прайшлі або поўнасьцю, або часткова (займаючы першае месца) у радзе гарадоў, як, напрыклад, Мантыны, Алюэне і г. д. Для павялічэньня колькасьці галасоў, пададзеных за камуністаў, характэрны вынікі выбараў у Лілі, дзе камуністычны сьпіс сабраў 4.500 галасоў проці 2.650-ці ў 1925 годзе. Гаварыць на падставе першага галасаваньня аб папчатковых выніках муніцыпальных выбараў цяжка. Аднак, можна спадзявацца, што камуністы застаюцца на сваіх пазіцыях.

БАРАЦЬБА АЎСТРЫЙСКІХ РАБОЧЫХ ПРОЦІ ФАШЫЗМУ.

ВЕНА, 7-5. Сацыял-дэмакратычны бургамістр Вены Зэйц заклікаў усе працэсіі, якія наладжваюцца баявымі арганізацыямі на тэрыторыі Вены. Забарона абвешчана ў зьвязку з наскокам сяброў арганізацыі Хэймвэру на „рабочы дом" 5-га мая пасьля працэсіі сяброў арганізацыі Хэймвэру ў прамысловым горадзе Санкт-Пэльтэне. Працэсія гэтая выклікала бурныя рабочыя маніфэстацыі пратэсту. Жандары ў некаторых мясцох пусьцілі ў ход прыклады. 24 рабочых было арыштавана і скаваныя адзін з адным праведзены па вуліцах. Фашысцкія рабочыя машынабудаўнічага заводу Штоцераў учора звольнены з прычыны рашучае адмовы іншых рабочых працаваць разам з фашыстамі. Рабочыя прадзільных фабрык у Нотэндорфе і Гунэзльдорфе і фабрыкі патронаў у Гіртэнберзе абвясьцілі забастоўку пратэсту, патрабуючы звольніць фашыстаў. У Гунэзльдорфе праца адноўлена пад нажымам рэфармісцкага сэкратара прафсаюзу.

Гэтая новая хваля

НА ФРОНЦЕ КУЛЬТУРНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ.

За новую школу.

СЯЛЯНЕ БУДУЮЦЬ НОВЫЯ ШКОЛЫ.

(Амсьціслаўскі райён, Арш. акр.).

...инства вёсак **Пустынкі і Зялёнуг** узбудзіла перад РВК хадайніцтва адчыненьні ў іх школы у 1929-...в. годзе і прапанавала са свайго ...пабудаваць на ўласныя сродкі но...будынак 2-камплектнае школы. ...К гэту ініцыятыву падтрымаў. ...заключылі з РВК дагавор на та...мовах: РВК абавязаўся адвесьці ...школу земельную дзялянку ў 3 ...ры і даць штатных працаўнікоў ...лаючы з 1929-30 нав. году, а ...ства абавязалася пабудаваць сва...ламі новы будынак 2-камплект...школы, закончыўшы яго к 15 ...я 1929 г. Прычым сяляне самі ...навалі ўнесьці ў дагавор пункт ...м, што ў выпадку, калі к тэр...школа ня будзе пабудавана, яны ...ць РВК няўстойку ў суме 400 р. ...ова распачата і праводзіцца пад ...ніцтвам райённага тэхніка.

Настаўніцтва райёну на сваёй канфэрэнцыі 14 красавіка г. г., абгаварыўшы пытаньне школьнага будаўніцтва на будучы год, паміж іншымі пастановамі прыняла і такую: „Узяць шэфства над пабудовай школы ў Віхранскай камуне, зрабіўшы яе апорнай па райёну, у якой правяраліся-б праграмы і мэтады працы вясковых школ. Дзеля дабудаваньня гэтае школы зрабіць адлікі з пэнсіі кожнага сябра саюзу ў разьмеры аднаднеўнага заработку, за выключэньнем асоб, якія атрымліваюць пэнсію менш за 30 р. Гэта дасьць на школьнае будаўніцтва каля 1000 руб.

Насельніцтва вёсак **Пастарнамі, Залачова, Валаўнікі** і інш. таксама выяўляе ініцыятыву ў справе школьнага будаўніцтва, але гэту ініцыятыву трэба своечасова падтрымаць.

П. К.

...РАПАНОВЫ т. АЛЕЙНІКАВА НЯЖЫЦЬЦЁВЫЯ.

...парадку абмеркаваньня ў „Савец...Беларусі“ (№ 93) надрукован ар... настаўніка Алейнікава аб рэар...цыі нашых 7-годак.

...джаюся з тым, што нашы 7-годкі ...буюць рэарганізацыі, ніяк нельга ...ца з тым, што раіць т. Алей...

...ін навучаньня ў 7-годках нельга ...ічыць да 8-9 год—тады будзе ...е 7-годка, а 8 або 9-годка. Пе...жа да 8 або 9-годкі ў той час, ...зас няма ўсеагульнага абавяз... навучаньня пачатковага, затар... увядзеньне ўсеагульнага абавяз... навучаньня. Гэта значыць ня ...неабходнасьці падцягнуць шы...фронтам працоўныя масы да ...ы.

...ат у першыя дні пасьля ўвя...ня ўсеагульнага абавязковага на...ня трэба зьвярнуць увагу на ...ічэньне колькасьці 7-годак, а не ...анізаваць іх у 8 або 9-годкі.

...ні праграмы для 7-годак занадта ...я, дык трэба не глядзець на іх, ...«Пракрустава ложа» і замест ...ня трымаць вучняў у 7-годцы ...і больш год, а перагледзець ...амы і сёе-тое з іх выкінуць, зра...сямігодку сапраўднай сямігод...

...ічні перастаюць вучыцца так, як ...магілі-б вучыцца, бо ведаюць, што ...ё роўна перавядуць“.—Надта ...а, калі вучні вучацца, выходзячы ...—пройдуць яны ў другую ко...і не. І надта дрэнна, калі т. Алей...ўе сваю тэорыю рэарганіза...годак выходзячы з такіх мерка...

...ьшаховасьць вучняў пры правіль...арганізацыі працы ў школе якраз ...ічаецца, калі вучні ведаюць, што ...оўна на другі год у гэтай самай ...сядзець ня прыдзецца—вучань ...хутчэй не пасароміцца зьвярнуцца ...стаўніка з тым ці іншым пы...ем. Настрой вучняў таксама будзе ...больш бадзёры, а гэта ў сваю чаргу павялічвае пасьпяховасьць.

Мы ведаем, што дзеці беднаты больш адстаюць у вучобе, дзякуючы ўмовам працы, якія ў іх заўсёды горшыя, чым у лепш забясьпечаных матар'яльна пластоў насельніцтва.

Тут мы больш будзем біць бедняка, выганяючы яго са школы, або пакідаючы на другі год у той самай клясе.

Калі ў І школе г. Менску настаўнікі не змаглі наладзіць дапамогу вучням, якія адстаюць у сваёй вучобе, дык гэта значыць, што яны не змаглі падыйсьці да гэтых вучняў, не змаглі выклікаць у іх актыўнасьць: тут віпавата ці казёншчына, ці несьвядомасьць у працы настаўніцтва.

Не малую ролю з адноўнага боку ў гэтай справе адыгрывае тое, што нашы сямігодкі да гэтага часу зьяўляюцца школай пераважна кніжнай вучобы, адарванай ад жыцьця наогул і, у прыватнасьці, ад жыцьця таго ці іншага вучня. Калі мы зможам падыйсьці ўплатную да вучня, да яго жыцьця, да яго пытаньняў,—мы яго зацікавілі вучобай, і ён пойдзе за нашы, ён будзе ў кніжцы шукаць дапаможніка ў жыцьці.

І нельга лічыць, як гэта робіць т. Алейнікаў, што: «Нашы вучні зьяўляюцца **дзецьмі** і патрэбныя веды яны набываюць не сьвядома, а фармальна і ўсю працу выконваюць толькі таму, што гэтага вымагае настаўнік».

Калі школа сямігодка яшчэ ня вызвалілася ад схаластыкі, калі яна не змагла падыйсьці да ўзросту вучняў, калі яна ня ўмее ўвязываць таго, што патрэбна будзе ў далейшай працы вучня, з яго сучаснымі інтарэсамі і з інтарэсамі пралетарыяту і ўсяго працоўнага насельніцтва,—гэта надта дрэнна. Карысьці з такой школы шмат менш, чым патрабуе наша сучаснасьць—сучаснасьць актывізацыі працоўных мас у перабудове грамады.

Настаўнік А. Цітавец.

Крупні, Аршанскай акругі.

Радасьць не надоўга.

...ралінскі МК працасьветы ў калдага...а 1929 г. унёс пункт аб прадастаў... і памяшканьня для бібліятэкі і пася...ніну РМК у будынку РВК. Хоць на ...годзе пралетарскай рэвалюцыі праф...ізацыя дабілася кутка для свае ша...кніжкамі. Ня доўга думаючы, сэк...МК саюзу дагаварыўшыся з сяб...РВК, у тым ліку і з райінспэкта...перанцягнуў у памяшканьне РВК ...афу з кніжкамі і справы МК.

Але-ж ня доўга прышлося радавацца Каралінскаму МК. Вяркуўся з паездкі па райёну старшыня РВК т. Карпяленя (дарэчы, сам былы прафработнік) і зараз-жа загадаў вынуць замінаўную яму шафу. Замест агульнай канцылярыі РВК, прафсаюзная шафа аказалася ў прахадным калідоры каля выхадных дзьвярэй.

Ці можна так кідацца калектыўным дагаворам?

Вед.

(Каралінскі р., Мазырчына).

Першая спроба.

(Пухавіцкі р., Менская акр.).

Вучні Гарэліцкае школы, слухаючы гутаркі настаўніка аб трактары, чыгунцы, РВК і г. д., сказалі: «Трэба сходзіць і паглядзець чыгунку і ўсё іншае». Пытаньне аб экскурсіі было ўгоднена з бацькамі вучняў.

Ад Гарольца да чыгуначнае станцыі (там-жа райённы цэнтр) 18 вёрст. Бадзёра шагалі вучні, нясучы за плячыма па 2 пары запасных лапцей.

Загадчык школы крыху раней дагаварыўся з РВК аб экскурсіі. Перад экскурсіяй адбыліся тры падрыхтоўчыя сходы. Намечана было канкрэтна аглядзець установы і машыны.

Аглядаецца цягнік. Вось ён рыхтуецца да адыходу.

Ніякія запытаньні, ніякае тлумачэньне ня могуць даць столькі ўражаньня, колькі дае непасрэдны агляд.

Вучні разглядаюць тэлефон і тэлеграф. З гадзіну працаўнікі пошты тлумачаць дзетвары пра набудаву тэлефону, але дзетвара ад красамоўных тлумачэньняў пачынае пазяхаць і прасіцца ў настаўніка да дому. Але вось тэлефонная трубка ў руках дзяцей. Яны размаўляюць на тэлефону. Факт трыманьня вучнем трубкі і размова дае ў тысячы разоў большае ўражаньне, чымся тлумачэньне.

Адным недахопам падрыхтоўкі да экскурсіі трэба лічыць тое, што ў плян экскурсіі ня было ўнесена пытаньне аб наладжаньні сувязі з райённым атрадам піянэраў. Весь гэта некаторыя т. т. з райёну і наставілі ў віну настаўнікам.

На самай экскурсіі піянэры пас. Марына-Горка, даведаўшыся аб прыходзе вучняў з далёкае школы, склікалі свой нечарговы сход супольна з вучнямі Гарэліцкае школы. Карысьць ад сходу надзвычайна вялікая. Тут-жа высьветлілася, што кожны піянэр мог узяць да сябе на кватэру вучня. Гэтым лепш наладзілася-б сувязь з піянэрамі, ды і кватэрнае пытаньне вырашылася-б значна лягчэй.

У гэтым вінаваты ня толькі настаўнікі, але і райінспэктар, старшыня РВК, загадчык Марына-Горскай школы, да якіх Гарэліцкая школа зварачвалася за тыдзень да экскурсіі з пытаньнем аб кватэрах.

Мне здаецца, што тут вінаваціць нікога ня трэба, а трэба толькі адзначыць, што ў райёне ня было практыкі ў правядзеньні падобных экскурсій і таму памылкі былі няўхільны.

Аднак, ня гледзячы на некаторыя хібы арганізацыйнага характару, экскурсія дала вучням Гарэліцкае школы вельмі і вельмі многа, тым больш, што ўсе ўстановы і арганізацыі прынялі экскурсію вельмі прыветліва і ўважліва.

Экскурсія Гарэліцкае школы ўзварухнула і іншыя школы.

С-ны.

Рэарганізацыя „Пэдтэхнікуму Дома“.

Народны Камісарыят асьветы яшчэ ў 1927 годзе пачаў адмуркваць шляхі для падвышэньня кваліфікацыі настаўнікаў.

Адным з такіх мерапрыёмстваў было—увядзеньне экстэрнату за пэдтэхнікум. Але, ня гледзячы на некалькі год яго існаваньня, станоўчых вынікаў гэтага мерапрыёмства не адчуваецца.

Другім мерапрыёмствам для падвышэньня кваліфікацыі масавага настаўніцтва была арганізацыя завочнага навучаньня і афармленьне адукацыі праз „Пэдтэхнікум Дома“. Настаўніцтва горача адгукнулася на гэта мерапрыёмства—па ўсіх пэдтэхнікумах запісалася 738 настаўнікаў. Але са ўсіх настаўнікаў, якія запісаліся ў „Пэдтэхнікум Дома“, за 2 залікавыя сэсіі пры ўсіх пэдтэхнікумах трымалі іспыты толькі 17 асоб, з якіх вытрымала 8, ды і то не па ўсіх прадметах.

Усё гэта прымусіла НКА яшчэ раз перагледзець мерапрыёмствы па падвышэньні кваліфікацыі настаўніцтва і паставіць яго на належны грунт.

Калегія НКА пастанавіла больш актыўна ўзяцца за працу падвышэньня і афармленьня кваліфікацыі вясковага настаўніцтва.

На падставе пастановы калегіі НКА было распрацавана новае палажэньне аб „Пэдтэхнікуме Дома“.

Новым палажэньнем, якое разгледжана і зацьверджана Наркамасьветы і ўзгоднена з прэзыдыумам ЦП саюзу працасьветы, уносяцца значныя зьмены ў ранейшае палажэньне аб „ПД“

Галоўнейшыя з іх:

Справа па кіраўніцтву „Пэдтэхнікум Дома“ ускладаецца толькі на адзін Менскі белпэдтэхнікум—цэнтралізаваным парадкам, пры якім вызначан загадчык „ПД“, а пры ім складзена арганізацыйна-кансультацыйнае бюро, якое і павінна кіраваць усёй працай завочнага навучаньня.

„Пэдтэхнікум Дома“ мае два тыпы: 4-хгадовы і 2-хгадовы. На 4-хгадовы „ПД“ будуць залічацца ўсе настаўнікі масавае школы і школ палітасьветы, якія цяпер працуюць у школах, але ня маюць сярэдняе агульнае адукацыі. На 2-хгадовы „ПД“ будуць залічацца ўсе настаўнікі, якія цяпер працуюць у школах, маюць сярэднюю адукацыю (скончылі 9-кі, 2-хгад. пэдкурсы, 2 курсы пэдтэхнікуму), але ня маюць спэцыяльнае пэдагагічнае адукацыі.

4-хгадовы „ПД“ носіць назву агульнага, а 2-хгадовы спэцыяльны. На спэцыяльны 2-хгад. курс патрэбна апрача закончанай сярэдняй адукацыі яшчэ 3-х гадовы стаж.

Беспрацоўныя сябры саюзу працасьветы будуць залічацца толькі тыя, якія працавалі ў савецкай школе ня менш 3-х гадоў.

Залічэньне ў „ПД“ будзе праводзіцца спэцыяльнай камісіяй. У гэтым годзе мяркуецца абхапіць толькі 500 наст. Прыём будзе адбывацца толькі адзін раз у год з 1-га мая па 1-ае верасня. Той настаўнік, які хоча навучацца ў „ПД“ павінен падаць заяву, запоўніць анкету і дасласць у менскі белпэдтэхнікум.

У аснову „Пэдтэхнікум Дома“ кладзецца навучальны плян і праграмы пэдтэхнікуму, дапасаваныя да масавага настаўніцтва. Кансультацыйнае бюро на чале з загадчыкам „ПД“ кіруе ўсёй навучальнай справай.

Навучаньне ў „ПД“ адбываецца спосабам рэгулярнай (у вызначаныя тэрміны) высылкі заданьняў. Да кожнага заданьня дадаецца рабочы друкаваны матар'ял або дасылаецца кніжка, калі яна будзе адпавядаць усяму курсу таго ці іншага прадмету; заданьні будуць складацца месячныя. Пасьля прапрацоўкі некалькіх заданьняў будзе давацца кантрольная пісьмовая праца, якая павінна быць дасланай у кансультацыйнае бюро, а пасьля паправак будзе вярнацца назад настаўніку.

За заданьні і рабочы матар'ял настаўнік павінен плаціць; заданьне з рабочым матар'ялам на м-ц будзе каштаваць у г. г. 50 к., а толькі заданьне—20 к.

Навучальны год падзяляецца на два сэмэстры. Іспыты магчыма будзе трымаць два разы ў год і толькі пры менскім белпэдтэхнікуме. Завочнікам будзе аказвацца некаторая дапамога для праезду на іспыты (льготны праезд і магчыма, кватэра).

Дзеля найбольшай дапамогі тым настаўнікам, якія будуць залічаны ў „ПД“, у распрацоўцы практычнага матар'ялу будзе даваццца магчымасьць карыстацца бібліятэкамі і габінэтамі тэхнікумаў і 7-мігодак.

Вось галоўныя прынцыповыя ўстаноўкі ў сучаснай пабудове завочнага навучаньня праз „ПД“

Падрабязнае палажэньне аб „ПД“ будзе дослана ўсім акруговым і райённым інспэктарам і пэдтэхнікумам.

Ал. Аніхоўскі.

„Савецкая Беларусь“ у паходзе за добрую кнігу.

Праблема культурнага трохкутніка: выдавецтва-прэса-чытач

Адно з найбольш цяжкіх заданьняў, якія стаяць перад кожным кніжным выдавецтвам,—гэта шырокае распаўсюджваньне кніжнай прадукцыі ў масах і вывучэньне масавага чытача. Якімі шляхамі ісьці, якімі сродкамі карыстацца, каб вырашыць гэтае заданьне?

І шляхі і сродкі павінны быць масавымі. Нам трэба чуць голас масавага чытача і гаварыць з ім.

Зразумела, што зрабіць гэта можна праз нашу пэрыядычную прэсу: газэты, часопісі і насьценгазэты. Ва ўсёй БССР такая вялізарная колькасьць іх, што пры дасканалым і плянавым скарыстаньні можна дасягнуць і вялізарных вынікаў. Дзесяткі газэт, часопісяў і тысячы насьценных газет—гэта-ж нязвычайнай сілы масавы культурны падважнік. Трэба толькі арганізаваць «пункт апоры», каб ён пачаў дзейнічаць яшчэ і па лініі распаўсюджваньня кнігі.

Такім пунктам апоры павінна быць самая шчыльная сувязь у штодзённай працы кнігавыдавецтва і ўсёй пэрыядычнай прэсы.

Што мы маем сягоньня ў гэтым сэнсе? Ні рэдакцыі цэнтральных газэт, ні рэдакцыі часопісяў ня маюць дакладнай інфармацыі пра тое, што выдавецтва падрыхтоўвае да друку, што друкуецца, што ў бліжэйшыя дні выйдзе на кніжны рынак. Калі такая вестка часам мільгане на старонках газэты ці ў аддзеле культурнай хронікі часопісі, дык гэта тлумачыцца выпадковай асабістай паінфармаванасьцю ці рэдактара ці супрацоўніка, які часьцей паведвае выдавецтва. Рэдакцыі акруговых газэт і насьценгазэт абсалютна пазбаўлены нават гэтай выпадковай інфармацыі.

Бібліяграфічна-рэцэнзэнцкія аддзелы ў цэнтральных газэтах і ў часопісях це арганізаваны ў сталыя, паважныя аддзелы, дзе-б супрацоўнічалі спэцыялісты гэтай справы і давалі матар'ялы па пляну і па пэўнаму заданьню рэдакцыі. Ня можа далей трываць такое становішча, калі рэцэнзіі на спэцыяльныя кнігі даюць неспэцыялісты прычым не даюць спэцыяльнай ацэнкі, а абмяжоўваюцца кароткім пераказам зьместу кніжкі. Чытач хоча ведаць ацэнку спэцыяліста, а не ацэнку накшталт—«кніжка карысная, але цана яе надта высокая», і г. д. Стварэньне пры рэдакцыях хоць-бы невялічкага кадру рэцэнзэнтаў па розных спэцыяльнасьцях ёсьць неадкладная справа, ад якой шмат залежыць попыт на кнігу. Напрыклад, газ. „Беларуская Вёска“ з яе 58-мітысячным тыражом можа нязвычайна дапамагчы прасоўванню сельска-гаспадарчай масавай літаратуры ў вёску, калі арганізуе сыстэматычны разгляд гэтай літаратуры праз спэцыялістаў-агранома ў, жывёлаводаў і г. д. Часопісь «Беларускі Піанэр» тое самае можа зрабіць для пашырэньня дзіцячай літаратуры ў масах маладых чытачоў.

Часопісь „Асьвета“—для дзіцячай і школьнай літаратуры, часопісь „Плуг“—для сялянскай літаратуры, „Бальшавік“ і „Прафрух“—для масавай палітычнай і г. д.

Дзесяткамі шляхоў можна ў нашых умовах падысьці да чытача, расказаць пра новыя кнігі, заахвоціць яго шукаць кнігу на рынку, купляць яе. Штодня выходзяць дзесяткі тысяч газэт, штодня пошта завозіць іх у самыя адлеглыя куткі рэспублікі, штодня чытаюць іх дзесяткі і сотні тысяч людзей..., а мы ня можам, ня ўмеем, ня хочам скарыстаць гэтай штодзённай масавай жывой сувязі з чытачамі. Пэрыядычная прэса пэрыфэрыі і насьценныя газэты—гэта-ж агромністае культурнае поле цаліны, якую трэба ўзараць, выкарыстаць. Трэба прарабіць цяжкую арганізацыйную, падрыхтоўчую работу, але паволі хапцца цяжкасьцяй—гэта значыць сьвядома адмовіцца ад багатага культурнага ўраджаю на кнігагандлёвым полі.

Выдавецтва мусіць узяць ініцыятыву ў арганізацыі жывой сувязі з рэдакцыямі газэт, часопісяў і насьценгазэт, стварыць нешта накшталт бюро сталай інфармацыі, якое давала-б матар'ял для рэдакцый па ўсіх галінах кніга-выдавецкай дзейнасьці, своечасова дасылала навінкі ў адпаведныя рэдакцыі, наладзіла перапіску з акруговымі газэтамі, пасылала рэкамэндацыйныя спіскі масавых бібліятэчак у рэдакцыі насьценных газэт і г. д.

Гэта-ж бюро павінна арганізаваць пры дапамозе газэт вывучэньне масавага чытача, яго рэакцыю на кнігі, характар попыту. Тут лепшы шлях—стварэньне жывой сувязі з рабкорамі і селькорамі, праз якіх можна пачуць сапраўдны голас масавага чытача. Рабкорам і селькорам, якія пачнуць прысылаць весткі, пасылаць усе навінкі масавай літаратуры, прасіць чытаць іх рабочым і сялянам і паведамляць, як чытачы рэагавалі на тую ці іншую кніжку

Культурны трохкутнік—выдавецтва, прэса і чытач—ёсьць, яго ня трэба ствараць нанова. Але ён ледзь жыве, ледзь падае час ад часу адзнакі жыцьця. Наша заданьне—ажывіць яго, умацаваць сувязь, якая часта разрываецца, аб'яднаць сілы вакол пытаньня пашырэньня кнігі ў масах. Зараз адбываецца спаборніцтва паміж фабрыкамі і заводамі ў галіне рацыяналізацыі і павялічэньня прадукцыі. Добра было-б, каб рэдакцыя якой-небудзь газэты ці часопісі выклікала на спаборніцтва іншыя рэдакцыі па справе прапаганды і пашырэньня масавае кнігі.

І. Ц.

ПРА МАСАВУЮ ЛІТАРАТУРУ.

(З поваду праэкту рэдакцыйна-выдавецкага пляну БДВ на 1929-30 г.).

Дзяржаўнае Выдавецтва стала зусім на правільны шлях, выносячы свой вытворчы плян будучага году на шырокае абгаварэньне нашай грамадзкасьці. Асабліва актуальным у сучасны момант зьяўляецца пытаньне аб стварэньні масавае кнігі. І сапраўды, цяпер, калі на барацьбу за пісьменнасьць, за культуру падымаюцца ўсё новыя і новыя пласты працоўных, калі з іх боку назіраецца вялізнае імкненьне да асьветы, і калі мы яшчэ ня маем жывых кадраў працаўнікоў, падрыхтаваных для абслугоўваньня культурных запатрабаваньняў мас,—робіцца зусім зразумелым, якое вялікае значэньне мае кніга і асабліва масавая кніга.

Масавая кніга павінна стаць магутным рухавіком культурнай рэвалюцыі, наймацнейшай прыладай выхаваньня мас і далучэньня іх да сьвядомага ўдзелу у сацыялістычным будаўніцтве. Адсутнасьць патрэбнай, цікавай, папулярна-навуковай кніжкі, якая здавальняла-б штодзённыя інтарэсы і практычныя запатрабаваньні, адчуваюць шырокія колы ня толькі вясковых чытачоў, але, ня ў меншай меры і гарадзкіх. У райённых бібліятэках пры нардамох, клюбах, хатах чытальнях, у бібліятэках-перасоўках чырвоных куткоў, на кніжных паліцах каапэратыўных крам—чытач, як селянін, так і рабочы, ня знойдзе сабе таннай і папулярнай кніжкі, якая ў даступнай для яго форме трактавала-б пытаньні: асноў марксызму-ленінізму, мінулага нашай партыі і рэвалюцыйнага руху, жыцьця і змаганьня прыгнечанага рабочага і селяніна ў капіталістычных дзяржавах і г. д. Саматужнік мястэчка і гораду дарэмна будзе шукаць літаратуры на цікавячых яго пытаньнях, бо такая літаратура ў нас яшчэ не напісана. Пагэтаму зусім відавочна аграмадное значэньне прыстасаванай да інтарэсаў шырокіх работніцка-сялянскіх чытацкіх колаў такой літаратуры, якая дапамагала-б узьнімаць і разьвіваць вытворчыя сілы краіны.

А між тым апублікаваны выдавецкі плян не канкрэтызаваны, асабліва па разьдзелу масавай літаратуры, з прычыны чаго мы лічым патрэбным падаць некаторыя свае меркаваньні.

Вось, напрыклад, выданьне літаратуры па пытаньнях саматужнае прамысловасьці плянам не прадугледжваецца. Мы-ж ведаем, што ў умовах нашае краіны, з спэцыфічнымі відамі буйнай прамысловасьці, саматужная вытворчасьць яшчэ адыгрывае значную ролю на нашым таварным рынку; а таму трэба паклапаціцца аб кніжнай прадукцыі для саматужнікаў па пытаньнях: тэхнаёгіі розных відаў саматужніцтва і рамяства, аб шляхох удасканаленьня рамесьніцкае вытворчасьці, аб арганізацыйна-вытворчых справах рамесьніцтва і саматужніцтва наогул, аб саматужных арцелях, аб'яднаньнях і г. д.

Плянам, як быццам, не прадбачыцца і выданьне літаратуры па чыста тэхнічных пытаньнях: радыё, кіно, электрычнасьці. Радыёпрыёмнік у хаце селяніна-бедняка і серадняка—ня толькі рэвалюцыя ў сялянскім быце, але і магутны сродак для падняцьця сялянскае гаспадаркі і яе калектывізацыі. Неадкладна патрэбна кніжка, якая дала-б селяніну элемэнтарныя веды аб радыё і парады, як аўладаць радыётэхнікай (устанавіць радыёпрыёмнік, адрамантаваць папсаваны і г. д.). У нас няма папулярных кніжок па электра-тэхніцы ў той час, як наша вёска паступова прасоўваецца на шлях электрафікацыі.

Сучасны кніжны рынак нічога ня можа даць рабочаму, які працуе ў хімічнай, харчовай, гарбарнай прамысловасьці, па пытаньнях, якія маюць блізкае дачыненьне да яго заняткаў і прафэсіі.

Закранутыя пытаньні патрабуюць дэтальнай прапрацоўкі і канкрэтызацыі.

Да праблемы стварэньня масавае кнігі неабходна прыцягнуць савецкую грамадзкасьць. Чаму-б, напрыклад, не арганізаваць пры нашых вышэйшых навуковых інстытуцыях (Акадэмія Навук, С.-Г. Акадэмія, Дзярж. Ун-т і інш.) так званых аўтарскіх калектываў. Падбор высокакваліфікаваных працаўнікоў і рэдактароў, шырокая пастаноўка вывучэньня інтарэсаў чытача—усё гэта дасьць добраякасную масавую кнігу. Існаваньне аўтарскіх калектываў, наяўнасьць строгіх плянаў іх работы паставіць справу выданьня масавае літаратуры на плянавыя рэйкі, вызваліць наш кніжны рынак з таго хаосу і неразьбярыхі, якія там нагладаюцца ў галіне выданьня масавае літаратуры.

Адначасова з праблемай стварэньня новае кнігі паўстае пытаньне аб яе распаўсюджваньні, аб набліжэньні да чытача. Тут трэба зрабіць вельмі многа; трэба ўзяць рашучы курс на арганізацыю інстытуту кніганош, скласьці для іх адпаведныя ўказаньні і памяткі, пашырыць сетку кіоскаў, удасканаліць працу каапэратыўных кніжных паліц. Карысна было-б практыкаваць на нашым кніжным рынку калектыўны і індывідуальны крэдыт для вясковага чытача; гэта мерапрыёмства наблізіла-б чытача да кнігі і разам з тым пашырыла-б абхват кніжнага рынку.

Віснар і Хоцька.

БУЛАЧКА, НАБІТАЯ ПОРАХАМ.

(Ліст з Полацку).

У г. Полацку і акрузе з кожным днём усё пашыраецца і пашыраецца антырэлігійная праца і растуць ячэйкі саюзу бязбожнікаў. Але ня гледзячы на гэта, ня толькі ня спыняюць, а нават шырэй і шырэй разгортваюць сваю працу сэктанты.

Галоўным месцам вярбоўкі новых сяброў у шэрагі баптыстаў зьяўляецца булачная на вул. Карла Маркса, у самым асяродку гораду, супроць каапэратыўнае сталоўкі. Гаспадар гэтай булачнай, таўсты і тлусты баптысты, дзейнічае досыць арыгінальнымі спосабамі. Ён апрацоўвае ўсіх сваіх наведвальнікаў, калі толькі яны бываюць без партфэляў. Людзей жа з партфэлямі ён ня хоча чапаць, каб не нарвацца на „пятрыемнасьць“.

З наведвальнікамі ён абыходзіцца вельмі далікатна і досыць сьмела. Вялікай яго ўвагай карыстаюцца чырвонаармейцы. Чырвонаармейцу ў гэтай баптысцкай булачнай дадуць за дзесяць капеек тую булку, што каштуе 15 кап., а калі трапіцца чалавек падатлівы і „падае надзеі“, дык яму дадуць булачку і дарэмна. Даюць дарэмна булачкі і сялянам, калі хто-небудзь з іх выказвае жаданьне стаць баптыстым

Гэты самы агітпроп баптыстых вядзе працу і сярод моладзі, асабліва дзяцей.

Вядуць працу баптысты і ў сваіх малельнях. Каб прыцягнуць да сябе моладзь, баптыстыя ў сваіх малельнях ладзяць сьпевы розных песень, нават савецкіх, а часам сьпяваюць нават „Інтэрнацыянал“. Ёсьць таксама ў іх і музычныя гурткі

Прабіраюцца ў прафсаюзную гушчу.

Чырвонаармейцаў перацягнуць да сябе баптыстам вельмі цяжка. Яны з баптыстаў толькі сьмяюцца. Сялян-жа для баптыстых мала. Таму яны лезуць у прафсаюзную гушчу. Некаторых членаў саюзу клічуць да сябе працаваць: удзельнічаць у харавых і музычных гурткох. За гэта даюць дапамогу матар'яльную. Быў выпадак, калі адзін член саюзу працаямлесу паступіў у абшчыну на рэлігійную працу. На працягу аднагодвух месяцаў ён плаціў у саюз членскія ўзносы, нібы так і павінна быць. А калі пасьля даведаліся дзе ён працуе і прапанавалі яму здаць членскі білет, ён адказаў:

— Я—абслугоўваючы пэрсанал, таму вы павінны зрабіць на мяне ўмову з абшчынай і лічыць мяне членам прафсаюзу.

У гэтым яму адмовілі і з саюзу выключылі.

І цуды ідуць у ход.

Перад польскім вялікаднем сэктанты пусьцілі па акрузе такую байку. Быццам нейкі бедны селянін вёў прадаваць на рынак карову. Яго перад горадам сустрэў голы чалавек і сказаў:

— Ты сходна прадасі карову адразу-ж, як толькі ўедзеш у горад. Далей ня едзь, бо там карову не прадасі. Пасьля гэтага ты павінен аддаць мне сваю вопратку, бо я голы.

Нібы так і здарылася. Селянін едучы дамоў, даў сваю вопратку голаму, які на дарозе яго чакаў. Гэты-ж голы сказаў селяніну, што на праваслаўны вялікдзень будзе канец сьвету. Ня ўсе аднолькава маніць умеюць, і некаторыя кажуць, што гэта быў голы мужчына, а некаторыя—што была голая жанчына. Хто-ж бачыў гэтага голага чалавека? Колькі ні шукалі, яго не знашлі, бо гэта толькі пушчаная хлусьня.

Іхны запраўдны твар.

У адным з палкоў, які стаіць у Полацку, быў такі выпадак. Сэктант Шапавалаў не хацеў браць у рукі вінтоўку. Яго засудзілі па паўтара гады. Але і пасьля гэтага ён вёў сваю працу і не хацеў браць вінтоўку. Ён вёў перапіску з сэктанцкімі кіраўнікамі, чакаючы парады як быць. Яму адказалі і назвалі дураком за тое, што ён адмаўляецца вучыцца страляць, бо гэта можа быць патрэбным у далейшым. Гэта вельмі яскрава кажа за тое, што кіраўнікі сэктантаў вядуць контр-рэвалюцыйную працу, што яны ў небясьпечны час выступяць супроць савецкае ўлады, дзеля чаго яны лічаць магчымым вучыцца і страляць. Шапавалаў аказаўся сэктантам фанатыкам і пасьля такога ліста ад сваіх кіраўнікоў застрэліўся

На вёсцы расьце антырэлігійная праца. Хаты-чытальні, чырвоныя куткі, нардамы і школы забясьпечаны антырэлігійнай літаратурай. Ячэйкі і гурткі бязбожнікаў растуць з кожным днём.

А. Калюжны.

МІЛАСЛАВІЦКАЯ СКЛОКА.

...чале Мілаславіцкай 7-мігадовай ...ы (Магілеўшчына) стаяў гр. Ма...ў, скончыўшы аднагадовыя кур...ы беларусазнаўства. З канца 1927 г. ...якой сыстэматычна ладзіў п'янкі, ...аючы ў гэтыя п'янкі настаўні...усей школы; у п'яным выглядзе ...ў на вуліцах, заходзіў на кватэ...настаўнік з крыкам: «Стаць, як ...начальствам», прымушаў іх аб...ць грязь з паліто і нагавіц, за...ваць боты лаючыся пры гэтым ...аступасьці вучняў. Маслакоў ра...а настаўнікам гэтае школы Ані...ка выяжджаў у суседнія школы, ...сама ладзіліся п'янкі. На ўсё ...траціліся вучэбныя дні пад відам ...ы, паездкі ў райённы цэнтр. Ра...ычныя інтрыгі гэтага загадчыка ...аюць шырокія памеры. Маслакоў ...віць жанчын у сваю школу, у ...ескую школу (тут-жа побач) і ...віць з імі ночы, гвалтуе настаў...ае школы, купляе ім падарункі, ...нуе выйсьці за яго замуж, за што ...е павялічыць пэнсію. А калі на...цы адхілялі яго прапановы ад ...цельстве, дык ён пачынаў іх ...ць, сеяць склокі ў настаўніцкім ...стве. Аб усім гэтым ведалі вуч...ны спрабавалі пісаць у друк, але-ж ...акой зацікае ім рот, не дапуска...надвесьці яго наводзіны падгонь ...рытыкі.

...зыніку такой працы загадчыка, на...ніцкі калектыў, у якім налічваецца ...соб, пашоў на шляху разлажэньня, ...ынцыпнасьці, склокаў, падхалім...рамантычныя інтрыгі перайшлі ...кія межы. На глебе рэўнасьці не...ыя настаўніцы гэтае школы аб...аюць адна адной байкот, абзыва...адна другую «дурай», «распутні...», даходзіць справа да істэрык на ...усяго настаўніцкага калектыву, ...ыюць вучняў і паасобных настаў...вакол сябе і натраўліваюць гэ...груны адну супроць другой.

...афунаўпаважаны, настаўнік гэтай ...ы Жынгароўскі, які паміж іншым на сваёй кваліфікацыі ня мае права выкладаць матэматыку і фізыку ў старэйшым канцэнтры і які зьяўляецца цэнтральнай фігурай гэтых рэўнасьцяў,—вельмі задаволен такой справай, закінуў свае прафсаюзныя справы, ды яму і часу ня было займацца прафэсыянальнымі справамі: трэба было будаваць пляны донжуанства, прыняць некаторы ўдзел у п'янцы з загадчыкам і потым выцягнуць яго з гразі на вуліцы і завесьці дамоў, трэба было падумаць, як прыкрыць бяспачыстае загадчыка. Малады настаўнік Аніпчанка заняў нейтральную пазіцыю, яго справа маўчаць, удзельнічаць у п'янках з загадчыкам, займацца падхалімствам, чакаць — чыя возьме верх.

Ёсьць і такія фігуры ў настаўніцкім калектыве, як настаўнік Рыжыкаў, які па сваёй кваліфікацыі зьяўляецца выпадковым настаўнікам другога канцэнтру і які вельмі баіцца, калі ў школу прызначаецца настаўнік з павышанай кваліфікацыяй. На працягу доўгага часу гэты настаўнік усвоіў такі мэтад працы: падхалімства, падслухоўваньне прыватных размоў настаўнікаў, каб затым перадаць іх усяму беламу сьвету ў перакручанай форме, стварэньне навакол сабе груп у асобе настаўкаў, накіроўваньне гэтых груп адна супроць другой. Кажуць, што Рыжыкаў такі мэтад працы ўсвоіў 3—4 гады таму назад. Выхаваўчая справа ў школе яго зусім ня тычыцца, у адносінах да гэтай працы ён нейтральны.

Дапамагае склокам у працы калектыву і жонка настаўніка Ч., якая ў школе не працуе. Яна разводзіць плёткі, прыходзіць у настаўніцкую і абзывае некаторых настаўніц «жыдоўкамі», а Ч. толькі ўхмыляецца. Ён бачыць усё, што робіцца ў школе, але-ж гэта справа яго ня тычыцца, ён баіцца самакрытыкі, баіцца падняць голас на школьнай радзе і дапамагае такім чынам паглыбленьню склок у калектыве. Настаўнік Сьцябуноў, стары паважаны настаўнік, той зусім рашыў маўчаць; на вачох яго праходзіць п'янка, ён ня хоча пакрыўдзіць Маслакова, бо ён жыў некаторы час на кватэры ў Сьцябунова. Таксама рашылі маўчаць і астатнія настаўнікі гэтае школы, звыкліся з такімі праявамі і становішчам і нагрузіліся ў балота склок і абывательшчыны.

На фоне ўсёй гэтай панарамы яскрава вызначалася фігура настаўніцы яўрэйскай школы Саколінай, якая прымае актыўны ўдзел у гэтых склоках, абярнула сваю кватэру ў месца розных зборышчаў. Хто толькі ні заходзіў у гэту кватэру і ўдзень і ўночы і што толькі там ні рабілася!

У выніку такой дзейнасьці Саколінай школа зусім

На нарадзе у ЦКК--РСІ.

Падрыхтоўка да чысткі савецкага апарату.

Пад старшынствам т. Калініна, старшыні ЦКК і Наркома РСІ, адбылася нарада старшынь АКК—РСІ па пытаньні аб падрыхтоўцы да чысткі савецкага апарату. Былі заслуханы інфармацыі з месц аб падрыхтоўчай працы, затым адбыўся абмен думак па пытаньню далейшага ўдасканаленьня гэтай працы.

Менская АКК—РСІ шырока разгарнула працу па падрыхтоўцы да чысткі савецкага апарату. У горадзе праведзена 17 сходаў рабочых і служачых, з пастаноўкаю на іх дакладаў аб значэньні чысткі апарату. Зацікаўленасьць з боку працоўных да гэтага надзвычайна важнага мерапрыёмства вельмі вялікая. На сходах многія выказваліся за ўтварэньне такіх умоў, каб вычашчаныя не папалі зноў на працу ў нашы ўстановы.

З 47 рабочых утвораны брыгады, якія прымацаваны да асобных устаноў дзеля выяўленьня працы апошніх і выяўленьня шкодных элементаў. Па некаторых установах сабраны ўжо значны матар'ял і складзены характарыстыкі на супрацоўнікаў. Праведзена падрыхтоўка да чысткі Біржы Працы. АКК—РСІ вядзе нагляд за працаю камісій садзейнічаньня.

У раёнах падрыхтоўка да чысткі апарату таксама разгарнулася. Як недахоп, трэба адзначыць, што палітычная сутнасьць чысткі ў некаторых мясцох яшчэ слаба папулярызавана сярод беднаты. Былі імкненьні ў некаторых раёнах самім праводзіць чыстку, але гэтыя зьявішчы ліквідаваны.

У Бабруйскай акрузе праведзена шэраг сходаў для папулярызацыі чысткі савецкага апарату. Вылучана 8 рабочых брыгад. Сіламі АКК—РСІ праверана падрыхтоўчая праца да чысткі ў 5 раёнах. Неабходна адзначыць, што досыць значная частка матар'ялу, які зьбіраецца да чысткі, не зьяўляецца грунтоўным. Прыняты крокі для падрыхтоўкі замены вычышчаных. З заводаў і фабрык вылучана па 5—7 рабочых, для якіх будуць арганізаваны курсы. Чалавек 30—40 будзе накіравана на працу ў раёны.

У Гомельскай акрузе ўся кіраўнічая праца па падрыхтоўцы да чысткі згуртавана ў АКК—РСІ. Галоўная ўвага была зьвернута на папулярызацыю чысткі сярод працоўных. Значную працу праводзяць 10 рабочых брыгад, якія прымацаваны да ўстаноў, дапамагаюць РСІ члены Гарсавету і „лёгкая кавалерыя"—моладзь. Пакуль што выяўляецца, галоўным чынам, сацыяльна чужы элемэнт ва ўстановах; бюракратаў, валакітчыкаў выяўлена вельмі мала. Характэрна адзначыць, што ў адным з устаноў знойдзена паперка з 30 рэзалюцыямі, прычым пытаньне гэтымі 30 рэзалюцыямі яшчэ ня вырашана.

У справу вылучэньня для замены вычышчаных уцягнуты прадпрыёмствы. З кожнага прадпрыёмства вылучана 5—10 рабочых, але ў справе падрыхтоўкі гэтых рабочых нічога ня зроблена. Грошай для арганізацыі курсаў няма, і, акрамя гэтага, у сучасны момант цяжка сказаць, якой спэцыяльнасьці патрэбны будуць працаўнікі для замены.

У Мазырскай акрузе праведзена нарада заг. устаноў, камісій садзейнічаньня і сход рабочых па пытаньнях чысткі савецкага апарату. Брыгады рабочых і „лёгкая кавалерыя" праводзяць расьсьледваньне матар'ялу, які далі ўстановы. Акруговыя ўстановы, а таксама і некаторыя раёны падрыхтоўваюць вельмі трафарэтны, дрэнны па якасьці матар'ял. З такім матар'ялам надзвычайна цяжка будзе праводзіць працу.

Самі служачыя не дапамагаюць выяўляць недахопы ў працы ўстаноў. У гэтым напрамку ёсьць рэальная дапамога з боку рабкораў, селькораў, членаў партыі і рабочых. Для замены вычышчаных праводзіцца вылучэньне. Вылучэнцы прымацованы да ўстаноў для прахаджэньня практыкі. Па 4 раёнах вылучаны камісіі для чысткі, якія вядуць падрыхтоўчую працу.

Магілеўская АКК—РСІ правяла значную працу па мабілізацыі грамадзкай думкі вакол пытаньня чысткі савецкага апарату. Ва ўсіх установах утвораны камісіі садзейнічаньня, яны інструктаваны і праводзяць працу. У некаторых раёнах справа абстаіць дрэнна. Ёсьць выпадкі, што яшчэ ня чыталі нават матар'ялаў аб чысткі, якія рассылала АКК—РСІ. Дапамагаюць у падрыхтоўцы да чысткі беднота і моладзь. Прафсаюзныя арганізацыі слаба прымаюць удзел у падрыхтоўчай працы. З вылучэньнем справа таксама абстаіць слаба. Галоўны недахоп тое, што ў гэту справу ня ўцягнуты масы.

У Полацкай акрузе таксама мабілізавана грамадзкая думка наваколь пытаньня чысткі савецкага апарату. Праведзены нарады сакратароў ячэек, сходы рабочых і служачых, нарада сэкратароў райкомаў КПБ і заг. устаноў.

Пытаньне аб чысткі апарату стаяла на пленумах сельсаветаў. Утвораны рабочыя брыгады. Слаба ўдзельнічаюць некаторыя саюзы ў падрыхтоўцы да чысткі. Быў у адным раёне такі казус, што пачалі самі камісіі на месцы зьнімаць некаторых супрацоўнікаў з працы. АКК-РСІ гэта спыніла. Вылучэньня праводзіцца, але з вылучэнцамі пакуль што праца не вядзецца, бо цяжка сказаць, якія патрэбны будуць для ўстанаў працаўнікі.

Тав. Калінін у сваім выступленьні адзначыў, што праца па падрыхтоўцы да чысткі савецкага апарату праведзена нездавальняюча.

— Мы зараз пакуль што ня можам прыступіць да чысткі. Асабліва дрэнна абстаіць справа з падрыхтоўкаю замены вычышчаных. Трэба тэрмінова, у парадку агляду ўстаноў праз друк, насьценныя газэты і г. д. устанавіць, якія ўстановы ў першую чаргу чысьцяць. Трэба выявіць тыя ўстановы, дзе скажаецца лінія партыі, дзе ня выконваюцца дырэктывы. Камісіі садзейнічаньня ў гэтых установах павінны выявіць, каго трэба вычысьціць, і на падставе гэтага ўжо можна будзе арыентыровачна ўстанавіць патрэбны лік працаўнікоў для замены.

Каго трэба вычысьціць? Тых асоб, якія скажаюць лінію партыі і ўраду, бюракратаў, безгаспадарнікаў, наогул, шкодны элемэнт, які ёсьць у нашых установах. Зразумела, што трэба зьвярнуць увагу і на пастаноўку тэхнічнай справы пры чыстцы.

Тав. Конанаў кажа, што далёка яшчэ ня ўсё зроблена ў справе падрыхтоўкі да чысткі. Ляпей не спяшацца з правядзеньнем чысткі, абы-добра падрыхтавацца да яе. Трэба мабілізаваць думку рабочых вакол пытаньня вылучэньня для замены вычышчаных і распачаць працу па падрыхтоўцы вылучэнцаў. Трэба абавязкова правесьці добра працу з камісіямі па чыстцы, каб яны ведалі беспамылкова, што і як рабіць. М.

Выкрыем усе хібы нашага апарату.

Аб аглядзе ўстаноў, якія падлягаюць чыстцы ў першую чаргу.

У канцы мая па БССР пачынаецца чыстка апарату першай чаргі ўстаноў—зямельных, фінансавых, дзяржстраху, банкаўскіх, статыстычных і судова-сьледчых.

Для таго, каб чыстку апарату правесьці здавальняюча, трэба мець падрабязнейшыя даныя аб тым, як працуе даны апарат, якія выкрыўленьні нашай палітыкі ён дапускае, якія ў ім былі выяўленьні выпадкі бюракратызму, валакіты і г. д. і г. д.

Да гэтага часу такога матар'ялу мы маем вельмі мала. Ні рабселькоры, ні рабочыя, ні сяляне, ні грамадзкія арганізацыі, ні самі ўстановы—такога матар'ялу не далі. Прыглядзеўшыся да таго матар'ялу, які рыхтавалі і зьбіралі ў працягу некалькіх месяцаў, можна падумаць, быццам у нашых установах зусім няма ні валакіты, ні скажэньняў, ні грубасьці. Зразумела, на справе гэта ня так; гэта толькі нам не ўдалося сабраць і аграмадзіць усё тое адмоўнае, што ёсьць у рабоце нашага апарату, і што добра вядома і рабселькорам, і масам, і грамадзкім арганізацыям. Проста мы недастаткова мабілізавалі грамадзкасьць вакол агляду нашых устаноў. Зараз яшчэ ня позна гэта выправіць і падцягнуцца, каб правесьці сапраўдны агляд тых устаноў, якія ўжо намечаны да чысткі, як гэта вырашана ўжо ЦКК РСІ.

Што-ж канкрэтна трэба рабіць?

Агульная прэса (газэты) выпукляе органы, намечаныя да чысткі, мабілізуе ўвагу карэспандэнтаў і сваіх супрацоўнікаў, рабочых і сялян на работу гэтых органаў і абвяшчае агляд іх, даючы спэцыяльныя заданьні рабселькорам і сваім супрацоўнікам асьвятляць непарадкі ў рабоце апарату цалкам, ці па асобных яго частках, або кожнага работніка ў прыватнасьці.

Трэба праз газэты вывучыць найбольш характэрныя моманты адмоўнай работы (агляд да чысткі павінен апэраваць пераважна матар'ялам адмоўным, каб на ім выявіць і канкрэтных вінавайцаў).

У якасьці вельмі добрага і вельмі карыснага для мэтаў чысткі матар'ялу можна прывесьці заметку з „Палескай Праўды" (ад 22-IУ—29 г.—„Хождение по бульжніку ў НКЗеме і Главпрокуратуре". У заметцы гаворыцца аб тым, як НКФ і Пракуратура БССР праводзілі абураючае скажэньне клясавай лініі ў справе нейкага падрадчыка Лапірова, якога Гомельскі Акрфа правільна аблажыў падаходным падаткам. У гэтай заметцы няма ўказаньняў на тое, што ў НКФ столькі-та б. афіцэраў, а ў НКЗ—земскіх начальнікаў—гаворыцца аб самым факце, але гэта як раз і зьяўляецца каштоўным. Вось менавіта такі матар'ял нам больш усяго патрэбны; нам трэба ведаць, дзе і якое было выкрыўленьне, дзе і ў чым выявілася валакіта і г. д.

Дык вось пад лёзунгам—„выкрыем усе недахопы нашага апарату"—і павінен пайсьці агляд пералічаных устаноў.

Агляд работы апарату і яго працаўнікоў не павінен абмежавацца агульнай прэсай. Тут могуць быць зьмешчаны заметкі больш агульнай уласьцівасьці (трэба толькі, каб газэты не паскупіліся на месца для каштоўнага матар'ялу); ня меншую ролю ў аглядзе павінны і могуць адыграць насьценгазэты. Насьценгазэты бяруць над абстрэл кожную паасобную частку свайго апарату, асобныя групы працаўнікоў і кожнага працаўніка паасобку, выкрываючы непарадкі і недахопы, выяўляючы канкрэтных вінавайцаў, выбіраючы ўвесь матар'ял аб выкрыўленьні лініі, выпадкі бюракратызму, грубых і зразумелых адносін да наведвальнікаў і г. д. і г. д. Карацей кажучы, увага павінна быць мабілізавана ня столькі на тым, хто працуе, колькі і як ён працуе.

У кампаніі па агляду ўстаноў павінны прыняць удзел ня толькі сталыя рабселькоры і супрацоўнікі газэт. Да гэтага неабходна шырэй прыцягнуць рабочых і сялян, „лёгкую кавалерыю", дэлегатак, членаў сэкцый саветаў. Трэба, каб яны паведамлялі ўсё, што ведаюць аб рабоце пералічаных устаноў.

Але і гэтага мала. Мы ўжо ў пэрыяд агляду ўстаноў першай чаргі павінны прыняць да выкананьня і рэалізацыі дырэктыву XVI партканфэрэнцыі аб „узаемным кантролі распараджэньняў цэнтру практыкай месц і практыкі месц кіраўніцтвам цэнтру"

Як можна рэалізаваць гэта ў даным выпадку?

Ніжэйшыя органы паведамляюць у прэсу або ў РСІ (але абавязкова куды-небудзь паведамляюць) усе свае, практыкай праверваныя, заўвагі адносна тых ці іншых выпадкаў бюракратычнага падыходу, няправільнага рашэньня, несваечасовага вырашэньня, нядачы тлумачэньняў на іх запыты і інш. выпадкаў работы вышэйшых органаў.

Вышэйшыя ў адносінах ніжэйшых праводзяць наогул такую-ж работу, далучаючы сюды моманты невыкананьня або скрыўленьня дырэктыў, затрымкі адказаў і іншыя адмоўныя моманты работы ніжэйшых органаў, вядомыя вышэйшым.

Гэткае ўзаемнае выяўленьне недахопаў дапаможа ня толькі таму, што лягчэй будзе знайсьці канкрэтных вінавайцаў зла,—гэта будзе вельмі карысна і для палепшаньня работы наогул.

У гэтых адносінах увесь агляд наогул бясспрэчна можа даць каштоўныя практычныя вынікі ня толькі справе чысткі апарату, але і агульнаму палепшаньню ўсёй работы.

Аднак, адрываць яго ад кампаніі па чыстцы, паколькі можна яго правесьці зараз-жа, ня варта, бо ён дае матар'ял і для самой чысткі.

Калі самі газэты, перш усяго, разгорнуць энэргічную кампанію па правядзеньні агляду і мабілізуюць увагу шырокай грамадзкасьці вакол работы намечаных устаноў, калі насьценныя газэты захочуць практычна арганізаваць абстрэл сваёй установы, калі самі ўстановы і органы будуць добрасумленна выконваць намянёную дырэктыву партканфэрэнцыі,—дык мы гэтым прыцягнем і масу працоўных і ў агульным выніку будзем мець карысны эфэкт.

Ф. Жукаў.

Чыстка ў нас.

(с. Бягомль, Менскае акр-).

Нядаўна ў нашым раёне пачалася чыстка савецкага апарату. Аб ёй шмат гаварылі. Ведалі пра яе ўжо даўно, але мэтад чысткі і працэс „ачышчэньня» быў невядомы. Заместа звычайных анкет, разгледжаных раней габінэтным парадкам, разглядаюць цяпер самога „хворага". Разглядаюць усе: спэцыяльна складзеная камісія, сяляне, служачыя, камсамольцы, дэлегаткі, піанэры. Усе пытаюцца, усе выказваюцца.

Тут успамінаюць кукішы старшыні с-г. крэдытнага таварыства. Сустрэнеце вы тут пару экзэмпляраў і з далёкага мінулага. Прамільгне перад вамі і твар п'яніцы, а то і цэлая кампанія пасьля «трудов праведных» ва ўстанове.

Часьцей сустракаюцца «пацыенты», хворыя грубымі адносінамі да насельніцтва. Усе гэтыя хваробы выкрываюцца тут. Неабходна адзначыць актыўны ўдзел у працы камісіі сялян.

Вынікі чысткі яшчэ невядомы канчаткова, але аздараўленьне ўжо прыкмячаецца. А.

Працоўная моладзь--у вайсковыя школы.

Вярбоўка ў вайсковыя школы.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам Менскі акруговы вайсковы камісар т. **Місьнікаў** наконт кампаніі вярбоўкі ў вайсковыя школы паведаміў наступнае:

— Мы надаём вялікае значэньне кампаніі вярбоўкі ў вайсковыя школы. Дзеля гэтага ў кожным раёне ўтвораны вярбовачныя камісіі. Пры буйных прадпрыёмствах г. г. Менску і Барысава складзены тройкі, якія павінны заняцца вярбоўкай рабочай моладзі ў школы. Партыйным, прафэсыянальным арганізацыям трэба зьвярнуць на гэту справу пільную ўвагу і правесьці шырокую растлумачальную кампанію. Вярбоўка ў школы працягнецца да жніўня. Сацыяльны склад моладзі, якая будзе прынята ў школы, разьмеркаваны так: 60 проц. рабочых, рэшта—батракі і сяляне. Райённыя вярбовачныя камісіі павінны зьвярнуць увагу на вярбоўку рабочых саўгасаў, удзельнікаў калгасаў і батрацтва.

Дзеля таго, каб даць магчымасьць падрыхтавацца ў школы, у Менску і Барысаве будуць заснаваны 3-хмесячныя вячэрнія курсы.

Адзіная.

Ленінградзкая школа вайсковых зносін імя Фрунзэ—адзіная ў СССР, якая падрыхтоўвае камандны склад чыгуначных войск РККА і начальніцкі склад для органаў перасоўваньня.

Задачы школы вызначаюцца дзейнасьцю чыгуначных войск на вайне, да якой трэба падрыхтаваць камандзіра.

Чыгуначнае войска мае па мэце аднаўляць і руйнаваць чыгункі, сувязь, каляіны, масты, станцыённыя будынкі, несьці службу па экспляатацыі чыгунак, гэтым самым дапамагаючы дзейнічаючым войскам у вырашэньні імі баявых задач, забясьпечваючы ім рухавасьць і падвоз усяго неабходнага для бою і для жыцьця.

Апроч таго, пад націскам абстаноўкі чыгуначнае войска можа прымаць непасрэдны ўдзел у баявых апэрацыях.

Школа ставіць мэтай падрыхтаваць камандзіра-ваенначыгуначніка, выпрацаваць у ім якасьці, патрэбныя для яго чыннасьці на вайне, і даць усе патрэбныя для яго чыннасьці тэхнічныя веды.

Але рабочая і сялянская моладзь не заўсёды ведае аб існаваньні гэтай школы, а калі і ведае, то ў меншай ступені, чым аб пяхотнай, кавалерыйскай і інш. школах. Маладым-жа чыгуначнікам трэба ведаць задачы школы падрабязна і падрыхтоўваць сябе да паступленьня ў яе, бо сама школа зацікаўлена ў тым, каб у яе ішла вучыцца рабочая моладзь транспарту, якая ўжо знаёма з некалькімі спэцыяльнасьцямі.

Школа падрыхтоўвае камандзіра, адпавядаючага вышэйазначаным запатрабаваньням, у працягу 4 год.

Існуюць аддзяленьні адпаведна асноўным спэцыяльнасьцям ваенна-чыгуначнай справы, а менавіта:

а) буксірныя аддзяленьні (яны-ж маставыя і пуцейскія);

б) мэханічныя аддзяленьні (цягавыя);

в) экспляатацыйныя аддзяленьні (руху і перасоўваньня войск).

Кожнае з гэтых аддзяленьняў дае курсанту спэцыяльную адукацыю па службе пуці, па службе цягі і экспляатацыі чыгунак, а таксама па службе перасоўваньня войск. Разьмеркаваньне курсантаў па спэцыяльнасьці адбываецца па прынцыпу дабраахвотнасьці курсантаў з вучотам іх спэцыяльнасьці і кваліфікацыі да паступленьня ў школу.

Парадак паступленьня такі самы, як і ва ўсе вайсковыя школы.

Рабоча-сялянская моладзь, маладыя чыгуначнікі, ідзеце вучыцца ў школу ВОСО!

Вад. Комар.

Рыхтуемся да выхаду ў лягеры.

Ж-скі Чырвонаштандартны страяк. полк).

Падрыхтоўчая работа да выхаду ў лягеры ўжо пачалася. На ўсіх падразьдзяленьнях палка праведзены гутаркі аб рабоце малодшага камандзіра ў лягерах і яго задачах.

У лягерах вядзецца работа па абсталяваньню ленкуткоў і інш. Праводзяцца сэмінары паліткіраўнікоў і групаводаў па пытаньню аб рабоце сярод навабранцаў. Гаспадарчая частка загатаўляе прадукты.

Я. Л.

ХРОНІКА.

У Прэзыдыуме Менскага Акрвыканкому.

Забясьпечаньне школ падручнікамі.

Прэзыдыум АВК зацьвердзіў дагавор інспэкцыі нарасьветы з Белдзяржвыдавецтвам аб забясьпечаньні культасьветных устаноў да новага навучальнага году падручнікамі, літаратурай і пэрыядычнымі выданьнямі, а таксама навучальнымі прыладамі і дапаможнікамі на агульную суму 121.000 руб.

Белдзяржвыдавецтва абавязалася ўвесь заказ выканаць да 1-га жніўня бягучага году.

Да конкурсу на лепшы райён па сельскай гаспадарцы.

Прэзыдыум АВК вылучыў пад старшынствам т. Акоючыца акруговую камісію для правядзеньня конкурсу на лепшы райён па сельскай гаспадарцы. Конкурс распачаўся і будзе скончаны 1-га верасьня 1930 году.

Новыя аўтобусныя рэйсы.

Прэзыдыум АВК згадзіўся з устанаўленьнем новых міжрайённых аўтобусных рэйсаў. Аўтобусы будуць курсаваць па лініях: Менск—Астр.-Гарадок—Лагойск—Плешчаніцы—Зембін — Барысаў; Зембін—Бягомль—Лепель; Барысаў—Халопенічы—Лепель; Менск—Сьмілавічы—Чэрвень—Бярэзіна; Узда—Когарэлае—Койданава; Менск Самахвалавічы—Узда — Копыль—Грэск—Слуцак.

Узмацніць працу па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

Прэзыдыум АВК абгаварыў даклад аб барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю ў Меншчыне.

Прэзыдыум адзначыў, што, не зважаючы на некаторыя дасягненьні ў гэтай галіне, усё-ж бяспрытульнасьць носіць стабільны характар. Т-ва „Прыхільнік Дзіцей" ня выявіла належнай ініцыятывы ў прыцягненьні да гэтага пытаньня грамадзкасьці, мала аддавалі ўвагі пытаньню барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю прафсаюзы, савецкія і іншыя арганізацыі.

Асабліва слаба стаіць праца Таварыства „Прыхільнік Дзіцей" на прадпрыёмствах. Ячэйкі т-ва ня прымаюць удзелу ў справе змаганьня з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

Прэзыдыум АВК даручыў камісіі апрацаваць практычныя мерапрыёмствы для палепшаньня працы па барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

Падарунак да 1 Мая Цэнтр. Дому Селяніна.

Сельска-гаспадарчы музэй пры Цэнтральным Доме Селяніна атрымаў ад Белсельпрамсаюзу ў падарунак да 1 Мая мадэль кросная для вырабу тканіны з асінавых стружак.

Пад ваенкораўскім абстрэлам.

У Гомелі ваенкоры Ж-ай часьці зрабілі масавы налёт для выяўленьня стану паходу за ўраджай, сацыялістычнага выпярэдніцтва і выяўленьня колькі ўдягнута ў паход і выпярэдніцтва працоўных, каб падштурхнуць адстаўшых, выкрыць нядбайства і г. д. У налёце прымала ўдзел 40 лепшых ваенкораў. Пад абстрэл былі ўзяты падпэфныя прадпрыёмствы і вёскі.

Рабочыя сустрэлі ваенкораў прыхільна, і адкрыта гаварылі аб сваіх дасягненьнях і недахопах. Апавядалі аб ходзе выпярэдніцтва, аб разгортваньні працы па выкананьню дырэктыў партыі і ўраду на зьніжэньню сабекошту прадукцыі і падвышэньню прадукцыйнасьці працы.

У сельскіх мясцовасьцях сялянства адносілася з вялікаю ўвагаю да налёту. У вёсцы Пакалюбічы ваенкоры выявілі, што камсамольская арганізацыя ніякай падрыхтоўкі да сьвяткаваньня 1 Мая не вядзе. У вёсцы не вядзецца антырэлігійная кампанія, няма насьценнай газэты. У некаторых камсамольцаў, вакол партрэтаў правадыроў, вісяць у хатах абразы.

ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ.

Адчыняюцца ўсебеларускія курсы.

25 мая пачынаюць працаваць паўтарамесячныя цэнтральныя ўсебеларускія курсы па падрыхтоўцы інструктароў фізкультуры. На курсах будзе навучацца 35 чалавек. Уся падрыхтоўчая праца да адчыненьня курсаў скончана. На ўтрыманьне курсаў адпушчана каля 5 тысяч руб.

Агляд фізкультурнай працы.

ВСФКБ скончыў абсьледаваньне становішча фізкультурнай працы ў Магілеўшчыне. Абсьледаваньне дало вельмі каштоўныя матар'ялы, якія дапамогуць лепш паставіць у акрузе фізкультурную справу. З 15 мая ВСФКБ пачне агляд становішча фізкультурнай працы ў Менскай акрузе.

Падрыхтоўка кіраўнікоў фізкультуры.

У Магілеве працуюць курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў масавай фізкультурнай працы ўлетку і сэкцыйнай працы. На курсах навучаецца 137 чалавек. На курсах існуе пэраг аддзяленьняў: футбольнае, валей-больнае, баскет-больнае лёгка-атлетычнае і аддзяленьне масавай летняй працы.

Адчыненьне летняга сэзону.

У нядзелю адчыняецца летні фізкультурны сэзон масавай дэманстрацыяй фізкультурнікаў. У гэты дзень фізкультурнікі будуць вітаць Усебеларускі Зьезд Саветаў. Фізкультурнікі ў гэты дзень наладжваюць масавую эстафету па гораду, а на спартыўнай пляцоўцы адбудуцца сустрэчы па футболу, баскет-болу, гарадкох і інш.

Пленум Менскага Акрсавету.

17 мая адбудзецца пашыраны пленум Менскага Акруговага Савету Фізкультуры. Пленум абгаворыць пытаньне падрыхтоўкі да масавай летняй працы, а таксама і да сялянскай спартакіяды.

Да вучоту пасеўное плошчы і жывёлы.

У бягучым месяцы Цэнтральная Статыстычная Управа Беларусі правядзе вучот плошчы, засеянай увесну г. г., а таксама і жывёлы ў калгасах, савгасах, іх аб'яднаньнях і мясцовых арганізацыях.

Калгасам і савгасам праз Акр. Стат. Бюро дасылаюцца анкеты, якія павінны запоўніць пасьля сканчэньня сяўбы галоўных культур (аўса, ячменю, бульбы) і адасласць па адрасе, паказаным у анкеце.

Акруговыя калгасэкцыі, упаўнаважаныя Белсельтрэсту і райвыканкомаў павінны прасачыць за ходам гэтай апэрацыі і аказаць належную дапамогу.

Культурныя навіны.

РАЗГЛЯД ПРАЭКТУ РЭФОРМЫ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСУ.

Закончана складаньне праэкту рэформы беларускага правапісу, які ў хуткім часе ўносіцца на разгляд акадэмічнай рады БАН. Праэкт праводзіць некаторае спрашчэньне правіл у галіне фанэтыкі і марфалёгіі і ўстанаўляе правілы правапісу чужаземных слоў і ўласных іменьняў, якія да гэтага часу ня былі апрацаваны.

ЗАПРАШЭНЬНЕ НА ПОЛЬСКІ ЗЬЕЗД ФІЛЁЛЁГАЎ.

БАН атрымала запрашэньне прынять удзел у працах зьезду клясычных філёлёгаў у Познані (Польшча), які адбудзецца ўлетку г. г.

ВЫВУЧЭНЬНЕ БЕЛАРУСКАЕ МУЗЫКІ.

Загадчык габінэту этнаграфічнай музыкі Украінскай Акадэміі Навук, кампазытар Квітко, прыехаў у БССР вывучаць беларускія народныя песьні і музыку. Тав. Квітко мае правесьці ў БССР цэлы год.

ПРЫЕЗД АКАДЭМІКА ПЭРЭЦА.

У канцы мая ў БАН мае прыехаць акадэмік Саюзнай і Украінскай Акадэміі Навук Пэрэц, які выступіць з дакладам на тэму: „Старажытная беларуская літаратура".

КІНО.

„СЫН РЫБАКА".

(Кіно «Інтэрнацыянал»).

Фільм „Сын рыбака"—гэта спроба даць кіно-біяграфію славутага расейскага вучонага Міхаілы Ламаносава. Фільм не падае чаго-небудзь новага з біяграфіі гэтага вялікага вучонага. Усё, што ў ім паказана, вядома з старых дарэвалюцыйных падручнікаў па гісторыі розных Дабрыніных і іншых. Нават і ідэалёгіі ня больш. Як там, так і тут малады Міхайла Ламаносаў сустракае шмат перашкод на сваім шляху. Коснасьць і тупасьць акадэмікаў ледзь ня губяць яго, але ён дамагаецца свайго, толькі канчае тым, што са словамі: „Мяне перамаглі, але на зьмену прыдуць іншыя"—уплывае некуды з рыбакамі...

У фільму няма ніякае спробы гістарычнага аналізу, ёсьць блытаніна стыляў, але ўцалку фільм не благі, глядзіцца лёгка і з прыемнасьцю. Гэтаму значна спрыяе добрая ігра артыстаў. Здавальняючая, а месцамі ўдалая (кадры буйным плянам) праца апэратара. Габ.

БІБЛІАГРАФІЯ.

МІЖ ЖЫЦЬЦЁМ І СЬМЕРЦЮ.

Зборнік нязвычайных апавяданьняў. Апрацоўка з расейскай мовы Ів. Цьвікевіча. Кніжка першая. Белдзяржвыдавецтва. Менск—1929. Стар. 61. Цана 45 к. Тыраж—5.000 экз.

Першая кніжка „Зборніка нязвычайных апавяданьняў", толькі што выпушчаная Белдзяржвыдавецтвам, складаецца з чатырох апавяданьняў. У першым з іх—„Дзевяць год пад зямлёй"—расказваецца аб нязвычайна рэдкім выпадку з канапірам расейскай арміі Івановым, якога ў часе сусьветнай вайны ад выбуху вялікай бомбы засыпала зямлёю і бэтоннымі абломкамі ў адным з фартоў Асавецкае цытадэлі. Канапір пражыў у падзямельні аж 9 год і калі яго потым адкапалі, дык ён, бы малпа, быў пакрыты валасамі і выглядаў сівым дзедам.

Апавяданьне чытаецца з захапленьнем і здаецца дзівам, як чалавек мог пражыць у поўнай адзіноце, а апошнія пяць гадоў і без сьвятла, бяз вопраткі, столькі часу пад зямлёю. Аднак, гэты факт, афіцыяльна сьцьверджаны.

У другім апавяданьні—„У воўчым палоне"—расказваецца, як паштальён Боб Грэй спаткаўся па дарозе з ваўкамі, якія яго чуць не загрызьлі. Боб выратаваўся толькі дзякуючы таму, што ў воўчай зграі знаходзіўся воўк,—мяшанец ваўка і сабакі,—якога Боб, калі воўк быў яшчэ шчанём, лячыў і вылечыў. Удзячная жывёла палюбіла тады Боба і доўга жыла пры ім. Аднак, урэшце, воўчая кроў перамагла і сабака-воўк уцёк у лес. Цяпер воўк аддзякаваў Боба, павёўшы ўсю нападаўшую воўчую зграю ў цёмны лес.

І трэцім апавяданьнем—„Пад дзігалам скарпіёна"—расказваецца аб бойцы скарпіёна з тарантулам і потым аб тым, як выратаваўся адзін чалавек ад сьмерці, калі-б скарпіён яго ўкусіў, бо ад укусу скарпіёна людзі паміраюць.

У апошнім апавяданьні—„У зубох тыгра"—расказваецца, як выратаваўся адзін індус з зубоў тыгра.

Зьмест усіх апавяданьняў вельмі цікавы і дае маладому чытачу, на якога кніжка і разьлічана, шмат карысных ведаў з жыцьця чалавека, шкодных дзікіх жывёл і казюлек.

Мова апавяданьняў до[illegible] чытаецца лёгка.

СЯЛЯНСКАЯ БІБЛ[illegible] № 105. ПОПЕЛ Я[illegible] ЕНЬНЕ.

Белдзяржвыдавецтва. А[illegible] цеўу Я. і Савіцкі М, Вок[illegible] чыны. Стар. 23. Цана 10 [illegible]

Цяпер, калі робіцца [illegible] для нашых палёў, дапал[illegible] вілася вельмі своечасова [illegible] паступны: хімічны склад [illegible] расьліна, хімічны склад [illegible] рысьць ад попельнага ўгн[illegible] сабы захаваньня і ўжыван[illegible] практычныя парады адно[illegible] ня палёў попелам і вывад[illegible]

Кніжка багата фактычн[illegible] вымі данымі і павінна пе[illegible] лянніна ў мэтазгоднасьці [illegible] попелу, як угнаеньня.

Тэрміналёлія ў большас[illegible] каў (нават амаль што заўс[illegible] нена з выданьнямі Інстыт[illegible] вае Мовы. Толькі на стар. [illegible] ходзім тэрмін „тамасаўка" [illegible] ванага ў народзе і прын[illegible] слова „тамашоўка".

Практычныя парады а[illegible] пельнага ўгнаеньня даюцц[illegible] ных лічбах—і таму могуць [illegible] ка выкарыстаны. Прадбачан[illegible] выпадкі. Улічаны ўсе чы[illegible] васьці розных глебаў, і роз[illegible] лінаў. Такім чынам гэтую [illegible] ба лічыць за вельмі карысн[illegible] канечна патрэбную для сел[illegible] дворны бок выданьня добры[illegible]

Л. С[illegible]

НОВЫЯ КНІГ[illegible]

Паступілі ў рэдакцыю газэт[illegible] кая Беларусь" для рэцэнзіі [illegible] часопісі.

1. „Савецкае Будаўніцтва" [illegible] месячны палітыка-эканамічн[illegible] Стар. 170, цана 1 руб. 50 к[illegible] Выданьне Дзяржпляну БСС[illegible]

2. „Печать и революция" [illegible] ная літаратуры, мастацтва, кр[illegible] ліграфіі. Стар. 186, цана 1 р. [illegible] Дзяржаўнага Выдавецтва М[illegible]

3. „Статистическое обозрен[illegible] Стар. 158, цана 1 р. 75 к. Выданьне ЦСУ Саюзу ССР.

4. „Полымя" за сакавік м-[illegible] ская часопісь літаратуры, пал[illegible] мікі, гісторыі. Стар. 182, цан[illegible] Беларускага Дзяржаўнага В[illegible]

Водгукі на карэспандэнцыі.

БЫЛЫ СТРАЖНІК ВЫКЛЮЧАН.

У допісе „Пасадзілі стражніка", пасланым на расьсьледваньне, паведамлялася, што сябром Шырокаўскага сельсавету па вёсцы Залесьце абраны былы стражнік Падлужын Р. Факт пацьвердзіўся. Падлужын выключан з складу сяброў сельсавету.

ГАНДЛЯРЫ ЗЬНЯТЫ З ПРАЦЫ.

У допісе „Спэкулянты-гандляры" зьмешчаным у № 57 за 11-II, паведамлялася, што Марына-горское спажывецкае таварыства адчыніла мясна-сальную краму і ў якасьці прадаўцоў туды прыняло 3-х братоў—былых буйных гандляроў. Факты пацьвердзіліся. Былыя гандляры-мясьнікі ўсе з працы зьняты.

ФАКТЫ НЕ ПАЦЬВЕРДЗІЛІСЯ.

У допісе „Доктар з моцными нэрвамі", зьмешчаным у № 46 ад 27-II, паведамлялася, што доктар Старадароскай больніцы Рэйзін не пашоў да хворай, якая без дапамогі памерла, таксама адмаўляўся лячыць хворых грыпам і накіроўваў іх у Бабруйск. Факты расьсьледваньнем не пацьвердзіліся.

ПРЫГОЖЫН САПРАЎДНЫ АРАНДАТАР.

У допісе „Капіталістычны элемэнт", зьмешчаным у № 74 за 3-IV паведамлялася, што грамадзянін Прыгожын, саматужнік і актывісты, быў няправільна пазбаўлен выбарчага права як арандатар, таксама фінчастка забрала за яго апошнюю карову, сап[illegible] арандатарам зьяўляецца матка на, якая з ім ня зьвязана.

Аршанская АКК РСІ паве[illegible] ступнае: Прыгожын сапраўды [illegible] арандатарам, афармляючы сваю [illegible] жонку, або матку, сам хаваўс[illegible] кай грамадзкага актывісты, б[illegible] на продажы садавіны ў Лен[illegible] там-жа аштрафаваны. Прыгожы[illegible] няк, мае 2 уласныя дамы ў [illegible] ніхто апошняй каровы ў яго [illegible]

ЗЛАЧЫНЕЦ ПРЫЦЯГН[illegible] ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

У допісе „Злоўжываньні ста[illegible] вёлагадоўчага таварыства", з[illegible] у № 74, паведамлялася аб шэр[illegible] ставу і растрат старшыні Ст[illegible] вёлагадоўчага таварыства [illegible] Факты расьсьледваньнем пац[illegible] Куннароў зьняты з працы і [illegible] кіравана ў акругоны суд.

ЗРОБЛЕНА ПАПЯРЭДЖА[illegible]

У допісе «Сустрэча новага го[illegible] ным не расьсьледвана, пав[illegible] што загадчык ляскавіцкай жа[illegible] Пятрыкоўскага раёну, Казак, за[illegible] ніцьца ўдзелу ў антырэлігійны[illegible] разам з іншымі таварышамі пав[illegible] ную вечарыну з „бутэлькай".

Расьсьледваньнем факт пап[illegible] Пятрыкоўскім райкомам КП(б)Б [illegible] папярэджаньне Каз